ШТО ПАГЛЯДЗЕЦЬ У «НОЧ МУЗЕЯЎ»? 6



РЭХА НОТР-ДАМА 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

18 МАЯ 2019 г. СУБОТА

№ 91 (28958)

ЗВЯЗДА

ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЯ СЕСІЯ ДЛЯ ЎЛАДЫ

Аляксандр Лукашэнка: «Трэба зрабіць усё, каб выбары прайшлі на высокім узроўні»

Фота БелТА.

Працоўны тыдзень Прэзідэнта завяршыўся нарадай па арганізацыі і правядзенні выбараў у Палату прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі. Нарада адбылася ў Палацы Незалежнасці. Выступаючы перад прысутнымі, Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз нагадаў, што будучыя выбары стануць экзаменам для ўсіх органаў улады. Як падрыхтавацца і правесці кампанію на адзнаку «выдатна», абмеркавалі на сустрэчы з Прэзідэнтам кіраўнікі мясцовай улады і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый.

Дырыжор — мясцовая ўлада

Асаблівая роля ў надыходзячай кампаніі належыць мясцовым органам улады. Іх гатоўнасць да правядзення выбараў — самае актуальнае пытанне нарады. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што «без улады на месцах выбары будзе правесці не тое што складана, а немагчыма», а прайсці яны павінны на высокім узроўні.

«Дырыжорамі ў гэтым шматгранным, шматгалосным аркестры будуць мясцовыя органы ўлады», — сказаў кіраўнік краіны.

Менавіта яны будуць фарміраваць выбарчыя камісіі. Па патрабаванні Аляксандра Лукашэнкі зрабіць гэта неабходна ў адпаведнасці з заканадаўствам: дэмакратычна, адкрыта і з шырокім удзелам канструктыўных грамадскіх арганізацый, якія складаюць аснову нашай грамадзянскай супольнасці.

У адпаведнасці з законам

Выбары ў Палату прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі запланаваны на лістапад гэтага года, аптымальная дата вызначыцца ў найбліжэйшы час. Асноўныя перадвыбарчыя мерапрыемствы пачнуцца ўжо ў жніўні.

«Нам трэба папярэдне вырашыць усе арганізацыйныя пытанні, каб у перыяд актыўнай выбарчай кампаніі забяспечыць спакойную атмасферу для свабоднага волевыяўлення беларускага народа. Патрабаванні да правядзення выбарчай кампаніі нязменныя. Гэта павінны быць сумленныя і справядлівыя выбары, без надуманых абмежаванняў, каб ні ў кога не ўзнікла сумнення ў іх легітымнасці», — сказаў Прэзідэнт.

Існуючыя правілы вядомыя: Выбарчы кодэкс напярэдадні не мяняўся. Асноўная задача для ўлады — зрабіць усё ў строгай адпаведнасці з заканадаўствам і для свайго народа.

«Яшчэ раз хачу падкрэсліць: выбары мы арганізоўваем для сваёй краіны, для Беларусі. Мы, вядома, не жадаем папасці пад крытыку нашых суседзяў, прадстаўнікоў іншых краін. Але, тым не менш, памятаць трэба галоўнае: гэтыя выбары беларускія», — падкрэсліў лідар дзяржавы.

Поспех кампаніі, па меркаванні Аляксандра Лукашэнкі, у многім залежыць ад зладжанай камандnай працы з асабістай адказнасцю за даручаную справу кожнага з удзельнікаў нарады і тых, хто будзе працаваць у камісіях.

Сапраўдныя народныя выбраннікі

Прэзідэнт растлумачыў, якім чынам кандыдаты павінны апраўдаць званне народных выбраннікаў: «Толькі тым парламентарыям, хто выканаў усе свае перадвыбарчыя абяцанні, змог наладзіць дзейсную сувязь з выбаршчыкамі, карыстаецца ў іх рэальнай падтрымкай і даверам, будзе месца ў новым складзе вышэйшага прадстаўнічага органа ўлады. Я намякаю на тое, што кандыдатам у дэпутаты трэба будзе сустракацца з народам, размаўляць, тлумачыць сваю пазіцыю і тое, як яны будуць працаваць у парламенце».

СТАР. 2

НА САЛАЎІНЫМ КАНЦЭРЦЕ

Гэтую сям'ю ў горадзе энергетыкаў Новалукомлі ведаюць усе: у Віталя і Галіны КАШЧЭЕВЫХ тры дачкі і сынок: Эвеліна, Юлія, Дзіяна і чатырохгадовы Славік. Дзяўчынкі выдатна вучацца ў школе, займаюцца музыкай і выяўленчым мастацтвам. А яшчэ ў сям'і сваё хобі, якое адрознівае яе ад іншых сем'яў, — назіранне за птушкамі. На берагах Лукомльскага вадасховішча водзіцца незлічоная колькасць крылатых. Сачыць за іх паводзінамі для Кашчэевых — незвычайная асалода, асабліва — вясновымі днямі, калі ідзе гнездавы перыяд. Справа ў тым, што сам гаспадар Віталь — грамадскі арнітолаг і пра птушак ведае амаль усё, часта дапамагае навукоўцам праводзіць улікі птушак. Але веды ў першую чаргу перадае сваім родным — у паходах, вандроўках, прагулках па парках і берагах. Гэтымі днямі пачаўся сезон салаўіных «канцэртаў», і, вядома, іх першымі слухачамі і гледачамі ў наваколлях Новалукомля стала сям'я Кашчэевых.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

ЛІЧБА ДНЯ

571 тысячу

чалавек прыняў у 2018 годзе Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Ён на першым месцы сярод самых наведваемых музеяў краіны па выніках мінулага года. Брэсцкую крэпасць наведалі летась 522,4 тысячы гасцей, музей-запаведнік «Нясвіж» — 421,9 тысячы. Чацвёрты радок займае Гомельскі палацава-паркавы ансамбль, у якім пабывалі 333 тысячы чалавек, пяты — замкавы комплекс «Мір» (319,7 тысячы), на шостым месцы — Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь» (237,5 тысячы). Сёння ў Беларусі дзейнічаюць 159 музеяў — з іх 97 комплексных, 43 гістарычныя, 13 мастацтвазнаўчых, чатыры літаратурныя і два прыродазнаўчыя. Для наведвальнікаў у 2018 годзе было арганізавана 4,6 тысячы часовых экспазіцый, праведзена 132,4 тысячы экскурсій, з якімі азнаёмілася амаль 7 мільёнаў чалавек.

На ўсе 100!

СТАРЭЦЬ НЕ АБАВЯЗКОВА!

Герыятр пра сакрэты доўгажыхароў і тое, што падаўжае наша жыццё

У нас прынята жадаць доўгіх гадоў жыцця. А што трэба рабіць, каб пражыць даўжэй? У кожнага з нас існуе свой парог ці ўсё ж прыроду можна падмануць? Як мы самі скарачаем сваё жыццё і чаму адпачынак павінен быць актыўным? Якія сакрэты маюць доўгажыхары? Пра гэта мы пагутарылі з кіраўніком Рэспубліканскага геранталагічнага цэнтра, намеснікам галоўнага ўрача Рэспубліканскага клінічнага шпіталя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны імя П. М. Машэрава Людмілай ЖЫЛЕВІЧ.

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

— Людміла Аверкіеўна, якія нашы звычкі скарачаюць жыццё?

— Працягласць жыцця ў многім залежыць ад паводзінскіх фактараў. Курэнне, злоўжыванне алкаголем, нізкая фізічная актыўнасць, няправільнае харчаванне — гэта даказаныя прычыны, якія скарачаюць жыццё. Наша даўгалецце на 50 % залежыць ад нас самі х. Ёсць і індывідуальныя фактары, напрыклад, генетыка, экалогія, у якой мы знаходзімся, паветра, якім дыхаем, нарэшце, той рабочы тэмп, які нам задае праца і які мы не можам змяніць. У такім выпадку трэба мяняць працу, калі яна не падыходзіць па біялагічных рытмах, нашых схільнасцях. Бо ўсё гэта ўплывае на працягласць жыцця. Але калі мы заклікаем: «Давайце падаўжаць жыццё!», то ў першую чаргу павінны мець на ўвазе здаровы, актыўны перыяд, калі чалавек на сваіх нагах, у сваім розуме і жыццё яму штодзень у радасць. Бо самае галоўнае ў даўгалецці — гэта незалежнасць. Кожны з нас жадае жыць доўга, але хоча, каб у гэты час ён быў незалежным ад блізкіх і іншых людзей.

СТАР. 7

Разумныя грошы

ПАЖАДАНА — У РУБЛЯХ І НАДОЎГА

Але пакуль большы аб'ём новых укладаў — у замежнай валюце

Куды і як укласці свае кроўныя, каб зарабіць, — над гэтым пытаннем задумваецца большасць людзей, незалежна ад колькасці нулёў на іх банкаўскім рахунку. Варыянтаў мноства, але яны залежаць не толькі ад сумы вашых зберажэнняў. Самае першае рашэнне, якое прыходзіць у галаву большасці і даступнае ўсім, — адкрыць дэпазіт. Але не ўсё так проста, бо тэндэнцыі змяняюцца.

Паводле звестак Нацыянальнага банка краіны, нашы грамадзяне захоўваюць 7,2 млрд долараў замежнай валюты і яшчэ 6,76 млрд беларускіх рублёў на дэпазітах у банках краіны. У якой жа валюце і на якія тэрміны беларусы часцей адкладаюць свае зберажэнні?

На доўгія тэрміны давяраюць не заўсёды

Нягледзячы на спагнанне падаходнага падатку з працэнтаў, атрыманых па банкаўскім укладзе тэрмінам менш за год, кліенты банкаў часта размяшчаюць грашовыя сродкі ў беларускіх рублях на кароткія тэрміны. Паводле інфармацыі Нацбанка, сёлета ў лютым доля такіх дэпазітаў у нашых банках склала 59,8 %.

Таксама статыстыка Нацбанка паказвае, што насельніцтва аддае перавагу безадзыўным укладам, што выклікана больш высокім памерам працэнтных ставак па іх. Па звестках на люты, іх суадносіны склалі 4,7 да 1 на карысць безадзыўных.

СТАР. 3

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Арыштаваны лідар баскскіх тэрарыстаў, якога шукалі 17 гадоў

Адзін з самых адшуканых Інтэрполам злачынцаў, колішні лідар баскскай тэрарыстычнай арганізацыі ЭТА 68-гадовы Хасэ Антоніа Уруцікоэчэа, вядомы па мянушцы Ёсу Тэрнера, затрыманы ў альпійскім гарадку Саланш, перадае Euronews. Гэта адбылося ў ходзе сумеснай аперацыі іспанскай Грамадзянскай гвардыі і французскіх спецслужбаў. Створаная ў 1959 годзе леварадыкальная арганізацыя ЭТА выступала за незалежнасць Краіны Баскаў — рэгіёна на поўначы Іспаніі і паўднёвым захадзе Францыі. У выніку здзейсненых яе членамі тэрактаў загінула больш чым 800 чалавек. Іспанскае правасуддзе патрабуе, каб Тэрнера судзілі за злачынствы супраць чалавечнасці. «У Францыі яму выстаўлены абвінавачанні. У той жа час іспанскія ўлады маюць намер задзейнічаць механізм еўрапейскага ордара на арышт. Гэта зробіць Нацыянальны вярхоўны суд», — заявіў кіраўнік МУС Іспаніі Фернанда Грандэ-Марласка. Іспанскія праваахоўнікі адшуквалі Тэрнера з 2002 года па справе аб нападзе ў 1987 годзе на паліцэйскую казарму ў Сарагосе. Тады ў выніку тэракту загінулі адзінаццаць чалавек, у тым ліку непаўналетнія.

Boeing абнавіў прашыўку 737 Max. Але забарона на іх пакуль не знята

Карпарацыя Boeing паведаміла аб завяршэнні працэсу абнаўлення праграмнага забеспячэння самалётаў сямейства 737 Max. Лайнеры гэтага тыпу пацярпелі крушэнне ў Інданезіі і Эфіопіі. Карпарацыя зараз дадае дадатковую інфармацыю, запытаную Федэральным кіраўніцтвам грамадзянскай авіяцыі ЗША (FAA), паведамляе Рэйтэр. Яна ў тым ліку ўключае пытанні аб тым, як павінны дзейнічаць пілоты ў розных рэжымах палёту. Пасля паведамлення гэтай інфармацыі Boeing сумесна з FAA заплануе сертыфікацыйны выпрабавальны палёт і прадставіць адпаведную канчатковую дакументацыю. 23 мая FAA правядзе ў Тэхасе канферэнцыю для прадстаўнікоў краін, дзе эксплуатуюцца самалёты Boeing 737 Max. Там ім агучаць інфармацыю пра абнаўленне прашыўкі для лайнераў і пра змены пры падрыхтоўцы пілотаў такіх самалётаў.

«Ролінг стоўнз» адпраўляецца ў тур па ЗША і Канадзе

Легендарны брытанскі рок-гурт The Rolling Stones пачне канцэртны тур па ЗША і Канадзе 21 чэрвеня. Гастролі стартуюць у Чыкага. Пра гэта гаворыцца ў заяве, апублікаванай на афіцыйным сайце музычнага калектыву. Выступленні павінны былі пачацца ў красавіку, але былі адкладзеныя ў сувязі з тым, што вакаліст Мік Джагер перанёс аперацыю па замене сардэчнага клапана. Днямі Джагер змясціў у «Твітэры» відэа, знятае ў танцавальнай студыі. 75-гадовы спявак прадэманстраваў добрую форму і, мяркуючы па ўсім, актыўна ідзе на папраўку. Паведамляецца, што ўсе запланаваныя раней канцэрты адбудуцца. Акрамя таго, у праграму дададзена выступленне «ролінгаў» у Новым Арлеане. Тур завершыцца ў Маямі 31 жніўня.

ISSN 1990 - 763X

КАРАТКА

- **ВУП Беларусі ў студзені — красавіку вырас на 1,4 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.**
- У Беларусі замежнікам могуць дазволіць афармляць ва ўласнасць зямельныя ўчасткі.
- **У Германіі стартап Lilium прадэманстраваў прататып лятальнага таксі на пяць месцаў.**

- Смяротнасць ад захворвання на злаякасныя новаўтварэнні ў краіне паступова памяншаецца.
- **Фестываль «Свята палявання» і чэмпіянат Еўропы сярод вабільшчыкаў аленя правядуць 24—25 мая ў Верхнядзвінскім раёне.**

Новы фармат

КНІЖНЫ ХАЙ-ТЭК

На сталічным праспекце Пераможцаў адчынілася абноўленая крама «Светач»

Учора ў сталіцы па адрасе праспект Пераможцаў, 11 пачала працаваць абноўленая, цяпер ужо найбуйнейшая кнігарня, «Дом кнігі «Светач». Шэрагі з выданнямі разгарнуліся на вялізнай светлай прасторы, якая займае некалькі паверхаў. Ёсць тут і прэзентацыйная зала для сустрэч з пісьменнікамі, і кавярня, дзе можна выпіць кубачак кавы.

Фота Кастуся ДРОБАВА.

— Як чалавек, які вельмі моцна любіць свой горад, які нарадзіўся і рос непадалёк ад «Светачы», адзначу, што гэта кнігарня заўсёды была маім любімым месцам, — гаворыць **першы намеснік старшыні Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ.** — У маім жыцці кніга адыгрывала важную ролю. Я перачытаў усё, што было ў дамашняй бібліятэцы; хадзіў у кнігарню, а паколькі грошай лішніх не было, то часам проста, каб пачытаць, а не набыць. Таму я вельмі рады адкрыццю новай крамы, такой рэінкарнацыі «Светачы» ў сучасным хай-тэк стылі. Важна, што яна не толькі прыгожая, але і светлая, адкрытая сонечным промням, адсюль можна бачыць наш горад. Істотна тое, што крама дае чытачу новыя магчымасці: можна прыйсці, пасядзець у кавярні, узяць кнігу, вырашыць, падабаецца яна ці не. Маецца спецыяльная апаратура, якая дазваляе знайсці пэўную кнігу ў каталозе.

СТАР. 2

ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЯ СЕСІЯ ДЛЯ ЎЛАДЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У складзе дэпутацкага корпуса неабходныя эксперты ў розных галінах — прадстаўнікі прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, юрысты, навуковыя работнікі, вядомыя ў рэгіёнах бізнесмены, палітыкі і грамадскія дзеячы. У той жа час яны павінны быць адказнымі, адданымі краіне людзьмі, высокаадукаванымі прафесіяналамі з дзяржаўным мысленнем.

«Важна, каб людзі, якія прыйдуць на выбарчыя ўчасткі, ведалі, што ўжо зрабіў іх дэпутат і што неабходна зрабіць заўтра для дабрабыту рэгіёна і ўсёй нашай краіны, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Парламент павінен стаць дыскусійнай пляцоўкай для дыялогу дэпутатаў з рознымі палітычнымі поглядамі, якія пры гэтым падзяляюць галоўныя прынцыпы: незалежнасць краіны, стабільнае развіццё і рост дабрабыту беларускага народа. Гэта галоўнае».

Як праходзяць выбары, працуе дэпутацкі корпус і наколькі выконваюцца абяцанні? Маніторынг гэтых пытанняў — задача сродкаў масавай інфармацыі.

«Чарговы раз падкрэсліваю, што выбары — гэта экзамен для дзеючай улады, у першую чаргу на мясцовым узроўні. Менавіта на выканаўчай вертыкалі — асаблівая адказнасць за палітычныя і эканамічныя працэсы ў рэгіёнах у перыяд электаральнай кампаніі. Стаўце задачы, мабілізуйце людзей, не адкладваючы рашэнне пытанняў на потым, на восень. Трэба рабіць усё цяпер. Добра, што гэтая праца пачалася і актывізавалася пасля «Вялікай размовы», — канстатаваў лідар дзяржавы.

Арганізаванасць і актыўнасць

Такімі адметнымі рысамі, па словах кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлі Качанавай, павінна валодаць будучая кампанія. Выбары — мерапрыемства масавае, таму сустрэча ў Прэзідэнта была прысвечана арганізацыйнаму складніку кампаніі.

«Гэта кампанія павінна прайсці вельмі спакойна, актыўна, арганізавана. І канешне, гэта задача мясцовых органаў улады арганізаваць усё так, каб выбары праходзілі на годным, высокім узроўні», — сказала Наталля Качанава, адзначыўшы, што такія задачы былі пастаўлены і кіраўнікам абласцей.

Падчас нарады размова ішла і наконт патрабаванняў да асобы кандыдата ў дэпутаты.

«Вельмі важна, якім будзе склад парламента, бо гэта асаблівы орган. Гэта той орган, які займаецца заканадаўчай працай і прадстаўляе розныя рэгіёны нашай краіны. Вядома, павінны быць людзі прафесійна адукаваныя, з актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Яны павінны быць вядомыя ў сябе ў рэгіёне», — лічыць кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Яна адзначыла, што дакладная дата выбараў не абмяркоўвалася. Гэта будзе зроблена пазней.

Па словах Наталлі Качанавай, грамадскія арганізацыі, напрыклад Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, ужо разглядаюць магчымасць вылучэння сваіх прадстаўнікоў у кандыдаты: «Мы маем зносіны, працуем з кіраўнікамі грамадскіх арганізацый і бачым, што ў моладзі сёння дастаткова высокая грамадзянская пазіцыя. Яны думаюць аб будучыні сваёй краіны. І, калі маладыя людзі прыйдуць і будуць працаваць у парламенце (а гэта добрая школа для станаўлення маладога чалавека), я думаю, што гэта будзе выдатна».

Асноўныя патрабаванні заканадаўства да будучых кандыдатаў у дэпутаты парламента:
1) грамадзянства Рэспублікі Беларусь;
2) узрост ад 21 года;
3) пастаяннае пражыванне на тэрыторыі нашай краіны;
4) адсутнасць судзімасці.
Права вылучаць кандыдатаў належыць палітычным партыям, працоўным калектывам і грамадзянам шляхам збору подпісаў.

Свет не стаіць на месцы, таму, вядома, кампанія-2019 не будзе аналагічная з мінулай. Але сур'ёзных змен не чакаецца.

«Мы дакладна ведаем нашу палітыку. Мы дакладна ведаем тыя ўстаноўкі, якія ёсць у нашай дзяржаве. Гэта ўсё павінна рабіцца дзеля людзей. Галоўнае — гэта людзі, сумленнае стаўленне да іх. Рашэнні, што прымаюцца, павінны быць на карысць дзяржаве. Таму ўнутраная палітыка якая была, такая і ёсць. Наша дзяржава сацыяльна арыентаваная, усё накіравана на дабрабыт нашых грамадзян. Зразумела, сусветная палітыка, знешнія ўмовы змяняюцца», — расказала кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

З уласнага вопыту работы ў рэгіёнах Наталля Качанава ведае, што людзі актыўна ўдзельнічаюць у выбарчых кампаніях.

«Важна, каб тыя кандыдаты ў дэпутаты, якія будуць балатавацца, працавалі з людзьмі. Трэба паказаць сябе, каб чалавек, які прыйшоў галасаваць за пэўнага кандыдата, выразна разумеў, што гэтага чалавека я бачыў, чуў яго выступленне, бачыў яго працу. І тады, канешне, не будзе пытанняў у людзей», — падкрэсліла яна і адзначыла, што чакае ад кандыдатаў актыўнасці.

Марыя ДАДАЛКА.

Напярэдзе — тыдні падлікаў

Працягваем асвятляць сітуацыю з забруджанай расійскай нафтай

...Падчас наведвання Студэнцкай вёскі Аляксандр Лукашэнка паведаміў журналістам, што Беларусь назаве суму шкоды ад паступлення забруджанай нафты ў нафтаправод «Дружба» пасля рэвізіі нафтаперапрацоўчых заводаў — мы пра гэта пісалі яшчэ 11 мая. Што ж адбылося ў апошні час па гэтай тэме?

14 мая ААТ «Нафтан» пачало прэтэнзійную працу ў дачыненні да расійскіх пастаўшчыкоў нафты, якія не выканалі сваіх абавязацельстваў за красавік. Намеснік генеральнага дырэктара па вытворчасці прадпрыемства Сяргей Алтухоў расказаў, што юрыдычная служба прадпрыемства арганізавала працу па выстаўленні штрафных санкцый у дачыненні да расійскіх пастаўшчыкоў за недапастаўкі якаснай нафты ў той месяц.

Пазней стала вядома інфармацыя са справаздачы за май Міжнароднага энергетычнага агенцтва: там сказана, што адным з наступстваў забруджвання трубапровода «Дружба» хлорарганікай можа стаць страта даверу пакупнікоў і пошук з іх боку новых пастаўшчыкоў.

16 мая Беларусь і Расія стварылі працоўную групу па ацэнцы страт ад забруджанай нафты. Віцэ-прэм'ер РФ Дзмітрый Козак па выніках сустрэчы з беларускім калегам Ігарам Ляшэнкам расказаў, што туды ўвойдуць прадстаўнікі «Белнафтахіма» і Мінэнерга Расіі.

Ён удакладніў, што ацэнкі памеру шкоды ад забруджвання нафты ў экспартным трубаправодзе «Дружба» могуць з'явіцца праз тры-чатыры тыдні.

Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Ігар Ляшэнка ўчора зноў паўтарыў, што Беларусь будзе настойваць на кампенсацыі з-за нявыкаснай нафты з РФ — аднак не толькі прамых, але і ўскосных страт.

Таксама віцэ-прэм'ер расказаў, што беларускі бок праінфармавалі пра магчымасць аднаўлення паставак нафты па трубаправодзе «Дружба» ў напрамку Польшчы на наступным тыдні. Было сказана, што аб'ём тэхнічных і дамоўных мерапрыемстваў, які рэалізуецца са спажыўцамі краін Заходняй Еўропы, як запэўніў расійскі бок, дазволіць у сямідзённы тэрмін запусціць адну нітку нафтаправода на Адамава. Што датычыцца аднаўлення працоўнага стану трубаправода «Дружба», канкрэтны тэрмін не быў названы.

Дарэчы, на наступным тыдні ўжо прэм'ер-міністры Расіі і Беларусі сустрэнуцца для абмеркавання сітуацыі.

Учора журналістам паведамілі, што «Белнафтахім» працягвае абмеркаванне ў Маскве сітуацыі з пастаўкамі расійскай нафты. Выпрацоўваецца новы вытворчы графік замены рэсурсамі «Транснафты» наяўнай у трубаправодзе нафты з павышанай хлорарганікай на чыстую для далейшага транзіту па ўсіх еўрапейскіх напрамках «Дружбы», а таксама ў напрамку ААТ «Нафтан».

Таксама ў канцэрне адзначылі, што нафты, якая пастаўляецца па ветцы Сургут — Полацк, недастаткова для поўнай загрузкі «Нафтана».

Паводле БелТА.

КНІЖНЫ ХАЙ-ТЭК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адразу каля ўвахода ў памяшканне размясціўся стэнд з кнігамі тых аўтараў, якіх стваральнікі экспазіцыі лічаць выбітнымі пісьменнікамі, пра што сведчаць і адпаведныя шыльды, — «Алексіевіч», «Караткевіч», «Чаргінец». Далей ідуць шэрагі выданняў, прысвечаных беларускім песнярамі, сярод якіх Уладзімір Мулявін, Міхал Клеафас Агінскі. Прадстаўлены якасныя сучасныя кнігі ў раздзеле «Гісторыя». Тут жа шмат добрых выданняў, прысвечаных беларускім мастакам.

— Адкрыццё такой кнігарні — знакавая падзея. Яна мае вялікае значэнне для развіцця айчыннага кнігагандлю, — упэўнены **міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.** — Адметна, што ў «Белкнігі» з'явіўся такі праект, які паказвае, як па-сучаснаму ўзаемадзейнічаць з чытачом. Я ўдзячны супрацоўнікам кнігарні (а іх тут працуе крыху больш чым 30 чалавек), якія вытрымалі гэты націск перабудовы і рамонту, што часова ўскладніў іх працу з пакупнікамі. Але ўсё будзе вернута да жыцця і актыўнай дзейнасці. Выдатна, што гандлёвыя плошчы пашырыліся і сталі адчыненыя для сучасных твораў. Да таго ж у новай кнігарні цудоўная лагістыка: можна знайсці адказы на пытанні, звязаныя з жыццём грамадства ва ўсіх сферах.

Дызайн кнігарні сапраўды ўражвае. У столь умантаваныя вялізныя светлавыя панэлі. Адмысловая канфігурацыя распрацавана для мэблі — яна мае незвычайную форму, у тым ліку зроблена ў выглядзе колаў і паўколаў. Аўтары інтэр'ера адзначаюць, што яны ўзялі за аснову скандынаўскі стыль. Але прыбралі «халоднасць», дадалі беларускай цеплыні і ўтульнасці.

Частка гандлёвай плошчы вылучана пад дзіцячы аддзел. Тут можна, напрыклад, убачыць шыльды з надпісамі «Для самых маленькіх», «Лагічныя гульні. Галаваломкі», «Гульні. Цацкі». Прыемна, што ўсе ўказальнікі ў «Светачы» зроблены на беларускай мове.

— Мяняецца свет. Але не змяняецца якасць кніг, — перакананы **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ.** — Змяняецца цікавасць да выданняў. Быў час, калі чытачы рынуліся ў інтэрнэт, думалі, што знойдуць у ім усё, што патрэбна. Але жыццё паказала вялікую розніцу: адна справа, калі ты прачытаў у інтэрнэце, а іншая, калі трымаеш у руках папяровае выданне, разважаеш, вяртаешся да прачытанага, думаеш, а як бы ты паступіў у той ці іншай сітуацыі. Раней вельмі шмат казалі пра талент пісьменніка, што, безумоўна, важна; але мы лічым, што пісьменнік павінен узбагачацца ведамі, якія, з аднаго боку, дазваляюць яму лепш пісаць, а з іншага — дапамагаюць людзям лепш жыць. Такую краму мы разглядаем як выдатную магчымасць зблізіць чытача з пісьменнікам, даць магчымасць прыхільніку нейчага таленту прыйсці не толькі паглядзець на аўтара, але і задаць яму пытанні.

У прэзентацыйнай зале першай сваё новае выданне прадставіла пісьменніца Наталля Батракова. І адначасова ва ўсёй сетцы «Белкнігі» пачала прадавацца яе кніга «Бясконцасць любові, бясконцасць суму». Таму ў гэты дзень у «Светачы» было не толькі шмат кніг, аўтараў, чытачоў, але і вельмі шмат кветак, падораных Наталлі Батраковай.

Зала для прэзентацый будзе дзейнічаць на пастаяннай аснове. Яна разлічана на 60 пасадачных месцаў і адчынена для ўсіх творцаў і іх чытачоў.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

ВАЖНЫЯ ЗВАНКІ

Прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 18 мая ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. З 9.00 да 12.00 адказваць на пытанні будуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

выконваючы абавязкі старшыні, першы намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Генадзь Міхайлавіч САЛАВЕЙ. Тэл. 8 023 233 12 37;

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Віктаравіч ПАРХАМОВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Пятровіч КРЭПАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

На слыху

Забойцаў міліцыянера шукаюць

Магілёў у шоку. Жахлівую навіну пра забойства маладога супрацоўніка ДАІ сёння абмяркоўваюць, здаецца, усюды. Вечарам у чацвер, калі здарылася няшчасце, горад гудзеў ад сірэн, на цэнтральных вуліцах было шмат міліцыі. Ніхто нічога не разумеў, пакуль позна вечарам не даведаліся: 22-гадовы лейтэнант міліцыі Яўген Патаповіч забіты пры выкананні службовых абавязкаў. Яго цела знойдзена за некалькі кіламетраў ад горада ў лясным масіве.

Пасля заканчэння Магілёўскага інстытута МУС малады лейтэнант не паспеў папрацаваць у ДАІ Магілёўскага аблвыканкама нават і года. У інтэрнэце пішуць, што Яўген быў адзіным сынам у сям'і. І сваю яшчэ не паспеў стварыць...

«Вясёлы, гаваркі, заўсёды мог прыйсці на дапамогу, — цытуюць у сецыве яго знаёмага. — Немагчыма паверыць у тое, што яго больш няма».

Пра апошні дзень Яўгена вядома няшмат. Паведамляюць, што ён адправіўся на заданне і праз некаторы час ад яго прыйшло паведамленне з арыенціроўкай. Па трывозе быў падняты ўвесь асабісты склад УУС Магілёўскага аблвыканкама і ўведзены план «Перахват», але выратаваць міліцыянера не атрымалася.

Следчым камітэтам Рэспублікі Беларусь распачата крымінальная справа па факце забойства супрацоўніка ДАІ (артыкул 362). Як паведамляецца на сайце ўстановы, цела 22-гадовага лейтэнанта міліцыі з прыкметамі гвалтоўнай смерці знойдзена 16 мая каля 20.45 у лясным масіве ў Магілёўскім раёне. Следчыя працавалі на месцы трагедыі амаль да раніцы, была задзейнічана перасоўная крыміналістычная лабараторыя. Знойдзены рэчавыя доказы, якія далучаны да справы. «Праводзяцца неадкладныя следчыя дзеянні і аператыўна-вышукоўвыя мерапрыемствы, дапытваюцца сведкі. Прызначаны шэраг экспертных даследаванняў, у тым ліку судова-медыцынская і комплексная судовая генатыпаскапічная экспертызы», — паведамляецца на сайце. Ход расследавання знаходзіцца на асабістым кантролі старшыні Следчага камітэта Івана Наскевіча.

Як патлумачыла **афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь Юлія ГАНЧАРОВА,** у інтарэсах следства ніякая іншая інфармацыя акрамя той, якая даецца на сайце Следчага камітэта, не распаўсюджваецца. На пытанне пра забойцаў міліцыянера яна коратка сказала: шукаем. На яе старонцы ў фэйсбуку размешчаны рэпост публікацыі ўпраўлення крымінальнага вышуку УУС Магілёўскага аблвыканкама. У ім гаворыцца, што праваахоўнікамі прымаюцца вычарпальныя меры па раскрыцці забойства супрацоўніка батальёна ДПС ДАІ УУС. І тут жа зварот да грамадзян, якія бачылі або маюць інфармацыю аб аўтамашыне, у якую 16 мая ў перыяд з 17 гадзін 30 хвілін да 18 гадзін 20 хвілін садзіўся інспектар ДПС ДАІ ў форменным абмундзіраванні. Гэта адбылося ў раёне вуліцы Першамайскай — завулка Мігая (гасцініца «Днепр») у Магілёве. Кіроўцаў транспартных сродкаў, якія знаходзіліся ў названы прамежак часу ў гэтым раёне, просяць перадаць запісы з відэарэгістратараў. Пры наяўнасці неабходнай інфармацыі тэлефануйце па нумарах — 8 (029) 314-46-66, 8 (029) 802-46-66, 8 (029) 693-64-25 або 102. «Ананімнасць і ўзнагарода гарантуюцца», — удакладняецца ў звароце. Новай інфармацыі па гэтай справе на момант здачы газеты ў друк не паступала.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Извещение о проведении аукционных торгов в Жабинковском районе Брестской области **ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ**

№ лота	Адрес участка	Кадастровый номер	Общая площадь (га)	Целевое назначение использования участка	Срок аренды, лет	Начальная цена предмета аукциона (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Расх. по подг. земел.-кадастр. док. (руб.)	Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке
1	**г. Жабинка, пер. Приозерный, 3**	122550100001002614	0,1383	строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	99	**4 923,48**	980,00	992,38	водоохранная зона пруда Визжар и канала Безымянный на всей площади
2	**г. Жабинка, ул. Кобринская, 39**	122550100001002717	0,1302	строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	99	**6 698,79**	1 330,00	1674,78	ограничений в использовании земель нет
Организатор аукционных торгов – КУППАПП «Жабинковская архитектура»				**Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУППАПП «Жабинковская архитектура» на р/с №BY30BLBB30120200216137001001 в ЦБУ № 402 ОАО «Белинвестбанк» г. Жабинка, ул. Свободы, 6а, код банка BLBBBY2X, УНП 200216137, ОКПО 148118831000**					

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462, и состоится при наличии не менее двух участников.

Перечень документов, представляемый участником аукциона: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором аукционных торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Размер штрафа уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462 – 2 550,00 рублей.

Земельный участок предоставляется победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона с условиями:

● в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победителем такого аукциона или в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся единственным участником несостоявшегося аукциона:

- внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка путем перечисления на расчетный счет фин. отдела исполкома;

- возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и затрат, связанных с формированием земельного участка, государственной регистрацией в отношении этого участка;

● не позднее двух рабочих дней после внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка и возмещения затрат заключить с исполнительным комитетом в установленном порядке договор аренды земельного участка и в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией права на земельный участок в Жабинковское бюро Кобринского филиала РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;

● получения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в трехмесячный срок со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на земельный участок в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство объекта;

● занятия (освоения) победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона земельного участка не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта;

● снятия победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона на земельном участке плодородного слоя почвы из-под пятен застройки и использования его для благоустройства участка.

Аукцион состоится 19 июня 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Жабинка, ул. Кирова, 65 (зал заседаний).

Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.00 18.05.2019 г. до 17.00 13.06.2019 г. (время работы – с 8.00 до 17.00 перерыв – с 12.00 до 13.00, вых.: суб., вс.) по адресу: г. Жабинка, ул. Свободы, 6а. Контактные телефоны: 8 (01641) 2 13 37, 8 (01641) 2 15 46.

Сайты: www.http:zhabinka.brest-region.gov.by и www.gki.gov.by

Извещение о проведении аукционных торгов в Жабинковском районе Брестской области в частную собственность граждан Республики Беларусь **ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ**

№ лота	Адрес участка	Кадастровый номер	Общая площадь (га)	Начальная цена предмета аукциона (BYN)	Сумма задатка (BYN)	Расход. по подг. земел.-кадастр. док. (BYN)	Наличие ограничений и охранных зон на земельном участке
1*	**г. Жабинка,** ул. Береговая, 8	122550100001002708	0,1500	**2 985,00**	590,00	1 320,63	0,0045 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт; на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки Мухавец) на всей площади
2*	**г. Жабинка,** ул. Береговая, 10	122550100001002709	0,1500	**2 985,00**	590,00	1 320,63	0,0045 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт; на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки Мухавец) на всей площади
3	Ракитницкий с/с, **д. Федьковичи,** ул. Абрикосовая, 8	122582404601000236	0,1656	**2 094,84**	410,00	1 294,88	0,0052 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт
4	Ракитницкий с/с, **д. Федьковичи,** ул. Абрикосовая, 10	122582404601000237	0,1681	**2 126,47**	420,00	1 203,52	0,0052 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт
5	Ракитницкий с/с, **д. Федьковичи,** ул. Абрикосовая, 12	122582404601000238	0,1615	**2 042,98**	400,00	1 203,52	0,0084 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт
6	Ракитницкий с/с, **д. Замошаны,** ул. Центральная, 11А	122582402101000087	0,1097	**1 625,75**	320,00	1 543,42	0,0020 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт; 0,0163 га – охранная зона линии электропередачи напряжением 110 кВ; 0,0035 га – охранная зона объектов газораспределительной системы
7	Ракитницкий с/с, **д. Задерть,** ул. Центральная, 33	122582401601000068	0,1581	**1 210,74**	240,00	928,65	ограничений в использовании земель нет
8	Ленинский с/с, **д. Шелухи,** ул. Центральная, 26	122581505601000028	0,2080	**1 830,40**	360,00	1 597,12	ограничений в использовании земель нет
9	Ленинский с/с, **д. Чижевщина,** ул. Центральная, 45Г	122581505101000191	0,2500	**4 550,00**	910,00	1 587,97	водоохранная зона реки Тростяница на всей площади; 0,0025 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт; 0,1920 га – на мелиоративных землях
10**	Жабинковский с/с, **д. Нагораны,** ул. Новая, 36	122580605101000102	0,2322	**4 467,53**	890,00	1 213,09	расположение на мелиоративных землях по всей площади
11	Жабинковский с/с, **аг. Большие Яковчицы,** ул. Центральная, 74	122580601101000138	0,2500	**3 120,00**	620,00	884,95	ограничений в использовании земель нет
12	Жабинковский с/с, **аг. Большие Яковчицы,** ул. Центральная, 75	122580601101000139	0,2437	**3 041,38**	600,00	835,69	0,0055 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт; 0,0120 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения
13	Озятский с/с, **аг. Озяты,** ул. Молодежная, 8	122582003101000298	0,2500	**5 382,00**	1 070,00	1 696,70	0,0129 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт
14	Озятский с/с, **аг. Озяты,** ул. Гомельская, 1	122582003101000299	0,1512	**1 572,48**	310,00	1 501,13	расположение на мелиоративных землях по всей площади

Целевое назначение использования участков – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома

*** - победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан компенсировать затраты на строительство распределительной и транспортной инфраструктуры в сумме 6 894,05 (шесть тысяч восемьсот девяносто четыре рубля пять копеек);**

**** - победитель аукциона, либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан возместить убытки в сумме 1 416,42 (одна тысяча четыреста шестнадцать рублей сорок две копейки), связанных с нарушением функционирования мелиоративных сооружений.**

Размер штрафа, уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462 – 2 550,00 рублей.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462 и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

Перечень документов, представляемый участником аукциона: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Организатор аукционных торгов – КУППАПП «Жабинковская архитектура»	**Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУППАПП «Жабинковская архитектура» на р/с № BY30BLBB30120200216137001001 в ЦБУ № 402 ОАО «Белинвестбанк» г. Жабинка, ул. Свободы, 6а, код банка BLBBBY2X, УНП 200216137, ОКПО 148118831000**

Земельный участок предоставляется в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона с условиями:

● в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победителем такого аукциона или в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся единственным участником несостоявшегося аукциона:

- внесения платы за земельный участок на расчетный счет соответствующего сельского (районного) исполнительного комитета;

- возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и затрат, связанных с формированием земельного участка, государственной регистрацией в отношении этого участка;

● обращения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в двухмесячный срок после подписания протокола о результатах аукциона или признания аукциона продажи несостоявшимся, за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

● получения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в установленном порядке и сроки технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

● занятия (освоения) победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона земельного участка не позднее одного года после государственной регистрации права на него;

● снятия победителем аукциона, либо единственным участником несостоявшегося аукциона на земельном участке плодородного слоя почвы из-под пятен застройки и использования его для благоустройства участка.

Аукцион состоится 19 июня 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Жабинка, ул. Кирова, 65 (зал заседаний).

Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.00 18.05.2019 г. до 17.00 13.06.2019 г. (время работы – с 8.00 до 17.00, перерыв – с 12.00 до 13.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Жабинка, ул. Свободы, 6а. Контактные телефоны: 8 (01641) 2 13 37, 8 (01641) 2 15 46.

Сайты: www.http:zhabinka.brest-region.gov.by и www.gki.gov.by

Извещение о проведении аукционных торгов в Жабинковском районе Брестской области в частную собственность граждан Республики Беларусь **ПО ПРОДАЖЕ НЕ ЗАВЕРШЕННЫХ СТРОИТЕЛЬСТВОМ НЕЗАКОНСЕРВИРОВАННЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ И ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ**

№ лота	Наименование объекта / Адрес участка	Кадастровый номер	Общая площадь (га)	Целевое назначение использования участка	Начальная цена предмета аукциона (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.)	Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т. ч. ограничения и условия в его использовании
1	не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Жабинка, ул. Сиреневая, 7 и земельный участок	122550100001001944	0,1276	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дама	**16 330,53**	3 260,00	**1513,90**	0,0059 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт; 0,0091 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления); 0,0781 га – водоохранная зона канала Безымянный
2	не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Жабинка, ул. Белорусская, 5 и земельный участок	122550100001000201	0,1350	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дама	**12 395,89**	2 470,00	**1551,12**	0,0022 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт. Водоохранная зона р. Жабинка на всей площади
Размер штрафа, уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220 и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232								2 550,00 рублей
Организатор аукционных торгов – КУППАПП «Жабинковская архитектура»				**Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУППАПП «Жабинковская архитектура» на р/с №BY30BLBB30120200216137001001 в ЦБУ № 402 ОАО «Белинвестбанк» г. Жабинка, ул. Свободы, 6а, код банка BLBBBY2X, УНП 200216137, ОКПО 148118831000**				

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. №220 и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

Перечень документов, представляемый участником аукциона: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:

● в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы,

З АГНЁМ ГУЛЬНЯЎ МЫ АДПРАВІЛІСЯ Ў КАР'ЕРЫ

ЯК ГЭТА БЫЛО

СЯРОД 450 шчасліўчыкаў, якім даверана несці факел з агнём II Еўрапейскіх гульняў, аказалася і я. Пра гэта мне паведамілі яшчэ зімой, аднак, па ўмовах арганізатараў, інфармацыю неабходна было трымаць у таямніцы. Пра месца дыстанцыі, якую трэба пераадолець, час усе факеланосцы даведваюцца толькі за месяц, і я не стала выключэннем.

Мой шлях з агнём Гульняў пралягаў па адным з найбуйнейшых прадпрыемстваў у Еўропе па здабычы і перапрацоўцы шчыльных горных парод «Граніт».

Мы прыехалі ў Мікашэвічы на дзень раней, каб пазнаёміцца з горадам і пабываць на прадпрыемстве, бо з агнём мне трэба было спусціцца ў кар'ер «Граніта», глыбіня якога дасягае 150 метраў, а там правезці яго на велізарным БелАЗе. Убачыўшы маштабы кар'ера, мы з фатографам, мякка кажучы, былі здзіўлены і міжволі пацягнуліся па тэлефоны, каб захаваць карцінку, але нас хутка спыніў начальнік аховы: «Сёння здымка забаронена, фатаграфавацца будзеце заўтра!» Зразумела, бо, каб здабываць камень, пад зямлю закладаецца выбухоўка, мала што застанецца на нашых фота...

Азнаёміўшыся з дыстанцыяй, мы адпраўляемся ў санаторый «Світанак», дарэчы, як аказалася, адзінае месца, дзе можна спыніцца гасцям у Мікашэвічах. Гасцінная галоўурач не толькі пасяліла нас у камфортныя нумары, але і прызначыла працэдуры, бо заўтра адказны дзень.

Што і казаць, дажджлівая раніца чацвярга — дзень майго самага адказнага старту ў жыцці — выдалася хвалюючай, учора ўсё здавалася значна прасцейшым. І справа нават не ў кар'еры, куды спускацца па мокрай зямлі, магчыма, і небяспечна, але пасля салігорскіх шахтаў, дзе мы раней пабывалі з беларускімі алімпійцамі, ужо не страшна. Хвалюе сам працэс. Уступнае слова перад работнікамі «Граніту» — і пасля ганаровага круга па адной з аглядальных пляцовак прадпрыемства намеснік генеральнага дырэктара па рэжыме, ахоўнай дзейнасці і бяспекі Сяргей Літвіцкі перадае мне эстафету. З факелам у руках адпраўляюся ў кар'еры, ад хвалявання не магу канцэнтраваць хуткасць, таму чую ад арганізатараў, што не варта спяшацца, бо за мной бягуць захавальнікі агню. Там, дзе бегчы ўжо нельга, мы садзімся ў картэж «Эстафеты міру», даязджаем да яшчэ адной аглядальнай пляцоўкі, перасаджваемся на велізарны БелАЗ, які працуе ў кар'ерах, і працягваем эстафету. Каб спусціцца ніжэй, нам неабходна зрабіць яшчэ адну перасадку, ужо ў спецыяльныя машыны, якім можна ехаць далей. Даязджаем да натуральных вадаспадаў, пра існаванне якіх, дарэчы, у нас у краіне я і не падазравала, робім фота на памяць і перадаём эстафету далей. Мой этап на гэтым заканчваецца, таму адчуваю палёгку і стомленасць, пачуццё выкананага абавязку і гонар за тое, што факел пабываў і ў мяне ў руках. А агонь Еўрапейскіх гульняў адпраўляецца далей, на чарзе — Гродзенская вобласць.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ. Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

БЕГ У ДАПАМОГУ ДЗЕЦЯМ

«Еўрапейскія забегі» #velcombegom стартавалі ў Брэсце з эстафетай «Полымя міру»

Гэта вялікі дабрачынны праект у дапамогу дзецям-спартсменам з абмежаванымі магчымасцямі, які сёлета стаў пара-складнікам II Еўрапейскіх гульняў. За 50 дзён удзельнікі праекта прабягуць 200 000 кіламетраў, а агульная сума дабрачыннай дапамогі ад кампаніі velcom і A1 складзе рэкордныя 200 000 рублёў.

Акцыя «Еўрапейскія забегі» дабрачыннага праекта #velcombegom пройдзе ў два этапы. Першы (з 12 мая да 20 чэрвеня) будзе праходзіць адначасова з эстафетай «Полымя міру», другі — падчас саміх спаборніцтваў II Еўрапейскіх гульняў (з 21 да 30 чэрвеня).

Аднымі з першых удзельнікаў дабрачыннай акцыі «Еўрапейскія забегі» сталі юныя спартсмены з Брэсцкай абласной цэнтральнай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву прафсаюзаў па лёгкай атлетыцы, прадстаўнікі бегавых супольнасцяў Брэста і супрацоўнікі кампаніі velcom і A1. 12 мая яны правялі сімвалічны дабрачынны забег ад сцен Брэсцкай крэпасці да цэнтральнай плошчы горада ўслед за эстафетай «Полымя міру».

«Еўрапейскія забегі» праводзяцца ў дапамогу дзецям-спартсменам з абмежаванымі магчымасцямі, якія актыўна займаюцца спортам і ў будучыні будуць абараняць гонар нашай краіны на міжнародных спаборніцтвах. Кожны, хто хоча дапамагчы дзецям, можа з 12 мая да 30 чэрвеня ў любы зручны для сябе час выходзіць на прабежкі, фіксаваць свае бегавыя вынікі пры дапамозе любой фітнес-праграмы, усталяванай на смартфон, і дзяліцца імі на сваёй старонцы ў сацыяльных сетках з хештэгамі #velcombegom, #A1 і #brightteam. Асаблівасцю «Еўрапейскіх забегаў» стане тое, што ў агульную скарбонку бегавых кіламетраў будзе ўключана дыстанцыя эстафеты «Полымя міру», а таксама вынікі ўсіх лёгкаатлетычных дыстанцый II Еўрапейскіх гульняў.

Дабрачынную дапамогу ў рамках акцыі «Еўрапейскія забегі» атрымаюць Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па Параалімпійскіх і Дэфлімпійскіх відах спорту і Гомельскі абласны цэнтр алімпійскага рэзерву па Параалімпійскіх і Дэфлімпійскіх відах спорту.

«Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў ужо другі год падтрымлівае праект #velcombegom — летась мы прымалі ў ім асабісты ўдзел, а сёлета выступаем партнёрамі. Акцыя «Еўрапейскія забегі» — гэта своеасаблівы пара-складнік II Еўрапейскіх гульняў, у якім можа прыняць удзел кожны жыхар Беларусі, кожны спартсмен — удзельнік Гульняў або госць нашай краіны, — адзначае **намеснік дырэктара фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Анатоль КОТАЎ.** — *«Еўрапейскія забегі» — важная дабрачынная ініцыятыва, закліканая дапамагчы дзецям-спартсменам з абмежаванымі магчымасцямі. А яшчэ гэта прыкметны грамадскі праект для папулярызацыі здаровага ладу жыцця, бегу і самой ідэі дабрачыннасці».*

Нагадаем, забегі #velcombegom праводзяцца штогод, пачынаючы з 2015 года. Па выніках мінулых дабрачынных забегаў фінансавую дапамогу ад кампаніі на агульную суму больш за 500 000 рублёў атрымалі 16 дзіцячых медыцынскіх устаноў з усіх рэгіёнаў Беларусі. Акцыя «Гарады, якія бягуць» увайшла ў ТОП-3 найлепшых камунікацыйных праектаў Усходняй Еўропы міжнароднай прэміі Eventiada IPRA Golden World Awards 2018.

У цэнтры Мінска пройдзе марафон «жалезнага чалавека»

Мультыспартыўная гонка Alfa-Bank Minsk Triathlon адбудзецца 21 ліпеня

Каля тысячы чалавек праплывуць у Мінскім моры, праедуць на веласіпедзе да цэнтра горада, пасля чаго пяройдуць на бег. Прайсці выпрабаванне «жалезнага чалавека» можа кожны ахвотны.

Упершыню гонка па трыятлоне перасячэ цэнтр сталіцы. Пачнецца спаборніцтва з хуткаснага заплыву ад Цэнтра паруснага спорту. Потым удзельнікам трэба будзе даехаць на веласіпедзе да Палаца спорту, пасля чаго прабегчы ў цэнтры Мінска. Падчас турніру, як і на паўмарафоне, будуць перакрытыя цэнтральныя вуліцы, у тым ліку праспект Пераможцаў. Дыстанцыя турніру ў параўнанні з мінулым годам павялічана ўдвая — з 1/8 да 1/4 Ironman, аднак, ва ўдзельнікаў таксама будзе магчымасць выбраць маршрут удвая карацейшы. Спаборніцтва збярэ каля тысячы чалавек з розных краін свету, гэта ў 2,5 раза больш, чым годам раней. Сёння сярод заяўленых прафесійных спартсменаў і аматараў прадстаўнікі васьмі краін, у тым ліку ЗША і Егіпта. Большасць слотаў ужо занята, найбольшай папулярнасцю карыстаецца катэгорыя 1/4 Ironman. У ёй плануе выступіць таксама самая вядомая і тытулаваная трыятланістка СНД, беларуска Ганна Максімава.

У Мінску таксама пройдзе дзіцячая гонка TriKids. Дзяцей ад 6 да 10 гадоў чакае забег на 500 м, а хлопцам і дзяўчатам ад 11 да 13 гадоў трэба будзе праплысці 100 м і прабегчы 1 км.

Кожны ўдзельнік атрымае стартавы пакет, у які ўключаны майка, плавальная шапачка, заплечнік, нумар з паясной гумкай, чып электроннай адзнакі, Racebook і страхоўка. На фінішы ўсім удзельнікам уручаць па медалі.

Напярэдадні турніру праходзяць бясплатныя трэніроўкі, кожны ахвотны можа прайсці базавы курс і за два месяцы падрыхтаваць сябе да гонкі.

«Пасля леташняга старту мы ўлічылі дапушчаныя памылкі і абралі іншы маршрут. Цяпер гэта будзе не толькі складаная і захапляльная гонка, але і прыгожае мерапрыемства для гледачоў, — запэўнівае **арганізатар спаборніцтваў і родапачынальнік беларускага трыятлона Дзмітрый ТАЛКАЧОЎ.** — *Тыя, хто прыступіў да трэніровак з пачатку года, ужо даволі добра падрыхтаваныя. Дзякуючы такому падыходу ўпэўнены, атрымаецца пазбегнуць інцыдэнтаў, калі людзі пераадольваюць маршрут з апошніх сіл. Мы ўсё ж сочым за тым, каб трыятлон мацаваў здароўе і тонус, а для гэтага рыхтуемся да гонкі паступова».*

Падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ПАЖАДАНА — У РУБЛЯХ І НАДОЎГА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Агульная інфармацыя па краіне пацвярджаецца статыстыкай нашага банка», — адзначае **намеснік дырэктара дэпартамента рознічнага бізнесу Банка «Дабрабыт» (аднаго з камерцыйных банкаў краіны) Вера ЯНУЦЬ.** Яна ж тлумачыць, што ў пачатку года доля адкрытых адзыўных укладаў ва ўсіх валютах склала 14,2 % ад агульнай колькасці, а доля безадзыўных, адпаведна, 85,8 %. Перш за ўсё гэта абумоўлена тым, што даходнасць па безадзыўных укладах значна вышэйшая, а давер насельніцтва да гэтага віда ўкладаў расце.

Калі прааналізаваць інфармацыю за першыя чатыры месяцы года, то можна зрабіць выснову: укладчыкі банка аддаюць перавагу адкрыццю безадзыўных укладаў як у нацыянальнай валюце, так і ў замежных валютах (долары, еўра, расійскія рублі).

ДВА САМЫЯ ПАПУЛЯРНЫЯ ТЭРМІНЫ ЎКЛАДАЎ

Калі казаць пра працягласць укладаў у беларускіх рублях, то найбольш запатрабаванымі, паводле звестак Нацбанка, безадзыўныя дэпазіты з тэрмінамі да трох месяцаў (30,5 %) і звыш 1 года (33,8 %). Што датычыцца валютных дэпазітаў, то тут больш раўнамернае размеркаванне: адзыўным укладам да года аддаюць перавагу 30,3 % укладчыкаў, безадзыўным звыш 1 года — 28,9 % кліентаў.

«Найбольшую перавагу ўкладчыкі банка аддаюць безадзыўным укладам у беларускіх рублях на тэрмін звыш 1 года (34,75 %) і безадзыўным укладам у замежнай валюце на той жа тэрмін (13,46 %), — адзначае Вера Януць. — Гэтаму спрыяе дэкрэт Прэзідэнта, згодна з якім працэнты па ўкладах у беларускіх рублях на тэрмін звыш 1 года, а ў замежнай валюце — на тэрмін звыш двух гадоў, не абкладаюцца падаходным падаткам».

Апошняя інфармацыя са статыстыкі Нацыянальнага банка паказвае адзін цікавы момант. Так, калі ў рублёвых дэпазітах людзі аддаюць перавагу безадзыўным укладам (82,4 %) з прычыны больш высокіх ставак, то ў валютных дэпазітах сітуацыя не такая адназначная — 44 % валютных дэпазітаў складаюць адзыўныя ўклады.

«У нашым банку сітуацыя іншая: амаль 38 % укладаў — гэта безадзыўныя дэпазіты ў замежнай валюце, — гаворыць Вера Януць. — Але ў цэлым па краіне такая сітуацыя тлумачыцца тым, што насельніцтва «назапашвае» патрэбную суму на дарагую пакупку (кватэра, аўтамабіль, дача і іншае). У такіх выпадках грошы могуць спатрэбіцца ў любы момант, што і схіляе людзей адкрываць адзыўныя ўклады».

НОВЫХ УКЛАДАЎ БОЛЬШ У ВАЛЮЦЕ

Па звестках Нацбанка, штомесяц аб'ём новых адкрытых валютных укладаў прыкладна ў два разы большы, чым рублёвых: 545,1 млн рублёў супраць 483,5 млн долараў (1041,4 млн рублёў у эквіваленце) за люты гэтага года. «У нашым банку назіраецца тая ж тэндэнцыя: 50,6 % укладаў адкрываецца ў замежнай валюце, а 49,4 % — у нацыянальнай, — адзначае Вера Януць. — Хоць сітуацыя часам вельмі зменлівая і вялікую ролю адыгрывае сезоннасць».

Эксперт адзначае, што пакуль прагнозы рабіць рана, але эканамічная сітуацыя ў краіне і меры фінансавага рэгулятара па ўмацаванні беларускага рубля будуць спрыяць росту долі новых дэпазітаў у нацыянальнай валюце.

❍ Тым часам

Цэны на мяса зніжаюцца

Гадавая базавая інфляцыя запаволілася да 4,6 % гадавых (4,9 % месяцам раней). У разрэзе груп тавараў і паслуг, якія не падлягаюць адміністрацыйнаму цэнавому рэгуляванню і ўплыву сезоннага фактару, адзначаецца запаволенне росту цэн на паслугі і харчовыя тавары. Сярэдняя інтэнсіўнасць прыросту спажывецкіх цэн знізілася да 3,9 %. Такія звесткі ўтрымліваюцца ў аглядзе інфляцыі, зробленым Нацбанкам, за мінулы красавік.

Але на некаторыя віды агародніны цэны ў нашай краіне паскорана растуць. Амаль паўсюдна даражэюць капуста, цыбуля, памідоры і морква. І гэта пры тым, што ў цэлым кошт харчовых тавараў практычна не павышаецца. Па звестках Нацбанка, у цэлым спажывецкія цэны ў красавіку гэтага года ў параўнанні з сакавіком узраслі ўсяго на 0,04 %.

У той жа час кошт харчовых тавараў практычна не ўзрос. У першую чаргу таму, што мяса і мясныя прадукты ў апошні час становяцца таннейшымі. «Пасля перыяду паскоранага падаражэння пад уплывам кан'юнктурнага шоку ў апошнія тры месяцы цэны на мяса зніжаюцца (адносна папярэдняга месяца). Цэны на нехарчовыя тавары за выключэннем рэгуляваных пазіцый пачынаючы з другога паўгоддзя 2017-га захоўваюцца практычна на адным узроўні ў гадавым выражэнні», — адзначылі ў Нацбанку.

У аглядзе таксама пазначана, што гадавы прырост рэгуляваных коштаў і тарыфаў у красавіку 2019 года захаваўся амаль на ўзроўні сакавіка і склаў 8,1 %. «Пры гэтым паскарэнне ў гадавым выражэнні тэмпаў росту цэн на аўтамабільнае паліва амаль цалкам нівеліравала запаволенне росту кошту астатніх рэгуляваных пазіцый (паслуг ЖКГ, сувязі і іншых)», — заключылі ў Нацбанку.

Сяргей КУРКАЧ.

Запрашальнік

НА ПАРТЫЗАНСКІ ПАРАД, ЯК У 1944-м

25 мая Мінская гарадская арганізацыя БРСМ запрашае мінчан і гасцей сталіцы прыняць удзел у маладзёжным патрыятычным праекце «Летам 44-га...», прысвечаным 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (вуліца Камсамольская, сквер).

Маштабны праект аб'яднае каля 700 юнакоў і дзяўчат. Яго цэнтральнай падзеяй стане рэканструкцыя шэсця партызанскага парада (13.00—13.30), які 75 гадоў таму, 16 ліпеня 1944 года, праходзіў у Мінску з нагоды вызвалення горада ад нямецкай акупацыі на былым гарадскім іпадроме ў раёне вуліцы Чырвонаармейскай. Парад, які аб'яднаў 30 тысяч чалавек і доўжыўся некалькі гадзін, стаў яркай старонкай у хроніцы Вялікай Айчыннай вайны.

Калона з конніцай, партызанамі і падпольшчыкамі, байцамі Чырвонай Арміі пройдзе па вуліцы Камсамольскай да скрыжавання вуліцы Кірава з праспектам Незалежнасці. Плануецца, што чаканіць крок перад імправізаваній трыбунай з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, удзельнікамі партызанскага руху і парада 1944 года будуць беларускія хлопцы — актывісты БРСМ устаноў вышэйшай адукацыі сталіцы.

Узначаліць партызанскі парад легендарны казёл па мянушцы Малыш. У далёкім 44-м ён красаваўся ў фуражцы нямецкага афіцэра і вялікіх акулярах, быў са стужкай з фашысцкімі ордэнамі і медалямі на грудзях, ракетніцай і санітарнай сумкай на баках. Парнакапытны ўдзельнік стаў адным з талісманаў славутага парада. Ён з'явіўся ў партызанскім атрадзе «Барацьба» брыгады «Народныя мсціўцы» восенню 1943 года. Агульны ўлюбёнец народу з партызанамі ўдзельнічаў ва ўсіх баявых аперацыях атрада і, ідучы за санінструктарам, пераносіў на баку санітарную сумку з медыкаментамі.

Да поўдня ў скверы на вуліцы Камсамольскай моладзь разгорне інтэрактыўныя пляцоўкі: зборны пункт РВК (раённага ваеннага камісарыята), штаб партызанскага руху, партызанскія лагер і шпіталь, камсамольскі падпольны штаб, ваенна-палявую пошту, фотаатэлье і іншыя. Тут жа, надзеўшы акуляры віртуальнай рэальнасці ў палявым кінатэатры пад адкрытым небам, можна будзе пабываць у цэнтры ваенных падзей, паўдзельнічаць у майстар-класах па страявой падрыхтоўцы, зборцы-разборцы аўтаматаў, стральбе ў ціры са зброі часоў Вялікай Айчыннай вайны, падшыўцы падкаўнерыкаў гімнасцёркі, намотванні ануч, а таксама прымерыць на сябе ролю вершніка, пракаціўшыся на кані, закруціцца ў рытме вальса, і, вядома ж, прадэгуставаць салдацкую кашу (бясплатна).

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПЛЮСЫ І МІНУСЫ РАННЯЙ ВЯСНЫ НА ПАЛЯХ «МУРАВЫ»

Спецыялістаў рыхтуй замалада, а пад прыроду падладжвайся ў час

Праца ў вёсцы заўжды была складанай і залежала ад капрызаў надвор'я ды наяўнасці тэхнікі. З кожным годам яна ўскладняецца яшчэ больш, бо нягледзячы на паляпшэнне рабочых умоў і тэхналагічны прагрэс, а дакладней нават дзякуючы ім сельскагаспадарчыя машыны становяцца ўсё больш мудрагелістымі. Каб працаваць з імі, патрэбна высокая кваліфікацыя, таму да прафесійнай адукацыі трэба падыходзіць скрупулёзна, а спецыялістаў падбіраць яшчэ падчас вучобы і замацоўваць іх у гаспадарцы. Толькі маючы тэхнічна падкаваныя кадры аграпрамысловы комплекс можа ўпэўнена развівацца. Так лічыць кіраўніцтва ААТ «Мурава» — адной з найлепшых у Пружанскім раёне гаспадарак.

Намеснік дырэктара ААТ «Мурава» Аляксандр МАРКЕЧКА і механізатар Уладзімір МУХЛЫНІН.

Складаным машынам — тэхнічна адукаваныя людзі

Падрыхтоўкай спецыялістаў для работы на сельгаспрадпрыемствах раней актыўна займаліся прафесійныя вучылішчы і вучэбна-прамысловыя комплексы (ВПК) пры школах. Гэта была вялікая дапамога для АПК.

— Сёння гэты момант упушчаны, аднак мы трымаем цесную сувязь з Пружанскім дзяржаўным аграрна-тэхнічным каледжам і іншымі навучальнымі ўстановамі. Тыя, хто да нас адтуль прыходзіць на работу, сядае за руль высокапрадукцыйнай энерганасычанай тэхнікі і спакойна працуе, — дзеліцца сакрэтам пошуку кадраў **Пётр БІЛЕЦКІ, старшыня ААТ «Мурава».** *— Сённяшняя тэхніка — гэта не толькі механічная частка. Яна камп'ютарызаваная, і каб кіраваць такімі дарагімі і складанымі машынамі, трэба быць тэхнічна адукаваным.*

Кіраўнік пружанскай гаспадаркі сам выпускнік каледжа, так што ведае праграму і якасць навучання не па чутках. Як кажуць у навучальнай установе, без работы не застаецца ніводзін студэнт — разбіраюць спецыялістаў яшчэ падчас вучобы.

Дырэктар ААТ «Мурава» Пётр БІЛЕЦКІ гутарыць з навучэнцамі сельскагаспадарчых каледжаў Яўгенам ШУМСКІМ і Дзмітрыем КАШКАРАВЫМ, якія ў час практыкі пераймаюць вопыт механізатараў гаспадаркі.

— Мы супрацоўнічаем з усімі гаспадаркамі Брэсцкай вобласці, таму што рыхтуем кадры сярэдняга звяна толькі для сельскагаспадарчай галіны. Для тэхнічнага і энергетычнага забеспячэння працэсаў сельскагаспадарчай вытворчасці рыхтуем тэхнікаўмеханікаў, слесараў па рамонце сельгасмашын і абсталявання, трактарыстаў, кіроўцаў катэгорый В і С, аграномаў, тэхнікаўэлектрыкаў, электраманцёраў 3-4 разрадаў і іншыя рабочыя спецыяльнасці. Сёлета плануем атрымаць ліцэнзію на перападрыхтоўку на катэгорыі D і E, — гаворыць **Станіслаў КОЗЕЛ, дырэктар Пружанскага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага каледжа.** *— Усяго ў нас 726 навучэнцаў-«очнікаў», 48 з якіх дзяўчаты, і 380 завочнікаў.*

Мы пагутарылі з моладдзю, каб даведацца пра іх планы на дарослае працоўнае жыццё.

Наталля КАНАВЕГА, трэцякурсніца, будучы механік са спецыялізацыяй слесар па рамонце сельгасабсталявання, трактарыст і камбайнер, кажа: *«Заўжды любіла тэхніку, таму не задумвалася, куды ісці вучыцца».*

— На тэхнічным забеспячэнні за амаль дзесяць гадоў маёй работы тут Наташа — першая дзяўчына, што вучыцца на дзённым аддзяленні, — прызнаўся дырэктар каледжа.

Мікіта СЯДОЎ, выпускнік-электраманцёр, гаворыць: *«Выбраў месца ў Брэсцкай перасовачнай механізаванай калоне (ПМК), на работу пайду ў маі, а заўтра — абарона дыплома».*

Навучэнцы настолькі запатрабаваныя, што могуць самі выбіраць месца работы згодна з рэйтынгам дыплома.

Ілья ЮНАШ, студэнт 4-га курса, будучы аграном. Плануе атрымаць вышэйшую адукацыю ў Гродне, а калі не атрымаецца, — на работу ў Ваўкавыскі раён, які ён выбраў сам. Юнак выходзіць на чырвоны дыплом, за плячыма ў яго 1-е месца ў рэспубліканскім конкурсе аграмайстэрства. Пры гэтым каледж заняў у гэтых спаборніцтвах трэцяе месца.

— Падрыхтоўка ў нашым каледжы лепшая, чым у астатніх, — кажа юнак. *— Калі я ўзяў першае месца, значыць мяне лепш навучылі. Да таго ж нашы выкладчыкі маюць практычны вопыт работы ў гаспадарках. Яны ведаюць моманты, пра якія тэарэтыкі нават не здагадваюцца.*

Арцём ПЕТРАНЬ, навучэнец 4-га курса, будучы аграном, па размеркаванні знайшоў сабе месца ў гаспадарцы «Ружанскае». *«Дзве тэхналагічныя практыкі ўжо там прайшоў. Мне спадабалася, таму ўжо мэтанакіравана пайду туды на работу»,* — падзяліўся юнак.

Іван ЯКУТА з 4-га курса вучыцца на механіка. Летась заняў трэцяе месца на Рэспубліканскім конкурсе прафесійнага майстэрства WorldSkills. Кампетэнцыю па сельскай гаспадарцы тады ў гэтыя спаборніцтвы ўвялі ўпершыню.

— Усе вынікі, якія паказваюць хлопцы і дзяўчаты, — гэта іх асабістая заслуга, мы толькі даём ім магчымасць развіць свае здольнасці, — кажа Станіслаў Козел. *— Мы нават не ўсе заяўкі можам закрыць ад прадпрыемстваў, бо проста не хапае выпускнікоў.*

Сухавеі, «лятучы» азот і ўстойлівая да засухі трава

Пасяўная збожжавых у «Мураве» сёлета скончылася рана. Бульба таксама апынулася ў зямлі ўжо ў сярэдзіне красавіка, хоць раней саджаць яе завяршалі на 9 мая, кажуць мясцовыя, разважаючы пра ранні надыход вясны. Зямлю тут выкарыстоўваюць настолькі рацыянальна, што ледзьве не адразу за акном дырэктара праходзіць ралля, па якой, пакуль мы гаворым, праходжваюцца буслы.

У аўдыторыі Пружанскага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага каледжа. Выкладчыца курса раслінаводства Вольга ЯКУТА (на здымку першая справа) і навучэнцы Сяргей КАЗЛОЎСКІ, Вера ЯРМАШУК, Дзяніс КАРАЛЬКЕВІЧ.

— Калі раней з некаторымі работамі не спраўляліся ў час пасля зімы, то сёлета ўжо грэх скардзіцца. Дзякуючы ранняй вясне атрымаўся вялікі прамежак часу паміж сяўбой і першым укосам траў. Была магчымасць падрыхтаваць і тэхніку, і людзей да першага «травянога ўраджаю», — характарызуе надвор'е Пётр Білецкі.

Блага аднак, што сухавеі ў раёне пануюць, дажджу зусім яшчэ не было ў красавіку, калі мы ездзілі ў госці ў гаспадарку.

— Гэта стрэсавы стан для раслін. Вільгаці ім няма, а ноччу яшчэ замаразкі бяруцца пасля дзённай спякоты. З майго вопыту магу сказаць, што калі каляндарная вясна дружна надыходзіць, то і ў дзве змены нашы людзі працуюць. Справа кіпіць. А калі вясна гарачая, то і сеяць трэба, і падкормку рана далі, а азот не працуе ў холадзе. Цяпер прыйдзецца другую падкормку рабіць, — кажа кіраўнік ААТ «Мурава».

З такім меркаваннем цалкам згодны **галоўны аграном гаспадаркі Міхаіл ГАЎРА,** які кажа, што работнікі вытворчасці ў цэлым адмоўна ставяцца да ранняй вясны, бо ў прыродзе ўсё павінна адбывацца так, як заведзена спрадвеку.

— Улічваючы паступовае змяненне клімату, напэўна, трэба перагледзець і структуру, і відавы склад культур. Тым больш што ў нашай гаспадарцы больш за ўсё лёгкіх глеб. Магчыма, трэба пашыраць пасевы кукурузы на зерне, а плошчы збожжавых культур памяншаць, — разважае ён. *— Час запасацца насеннем траў, устойлівых да засухі.*

Гэтая вясна была ранняя, аднак зацяжная, хоць узімку заўжды хочацца раней пачаць апрацоўваць палі, працягвае наш суразмоўнік:

— Мы выйшлі ў поле ўжо ў пачатку сакавіка, бо дазволіла тэмпература. У азімых на той момант пачалася вегетацыя, іх трэба было падкарміць азотнымі ўгнаеннямі. Аднак як толькі мы гэта зрабілі, пахаладала.

У выніку на асобных палях раслінам харчавання не тое што не хапіла, а некаторыя літаральна «засталіся галодныя», бо ўгнаенне проста выдзьмула з глебы, яно не паспела насыціць зямлю. Як пацяплела, расліны акрыялі. Але тут яшчэ адзін пагодны момант. Дажджоў у гаспадарцы на момант нашага прыезду не было больш як месяц, і ўся вільгаць, якая захавалася за зіму, скончылася.

— Вось калі вясна не толькі ранняя, а і тэмпература паступова павышаецца, то гэта добра. Калі пойдуць дажджы, то сітуацыя выправіцца. У нас пазаўчора і ўчора пылавыя бураны былі. Так што глеба ўсё больш падсыхае. Цяпер азімыя ўжо збіраюцца выходзіць у трубку. Ранняя вясна сёлета павялічыла вегетацыйны перыяд раслінам, адпаведна, павінен быць большы ўраджай, — мяркуе аграном. *— Летась ў чэрвені гаспадарку накрыла засуха, вегетацыйны перыяд скараціўся, і колас быў недаразвіты. У выніку мы недабралі трэцюю частку ўраджаю — атрымалі 5000 тон замест запланаваных 8000.*

Алена ЛАПЫКА, начальнік управлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні Пружанскага райвыканкама, у ранняй вясне таксама пакуль бачыць больш мінусаў, чым плюсаў:

— З зімоўкі выйшлі з мінімальным запасам вільгаці. А цяпер вецер і высокая тэмпература. Ветрам задуваюцца пасевы буракоў, якія, магчыма, зусім загінуць. Збожжавыя ўсходы і рапс пакуль трымаюцца нармальна. Галоўнае — дачакацца дажджу.

Яшчэ адна яскравая прыкмета анамальнай вясны ў гаспадарцы — ніводзін калёсны трактар сёлета ні разу не захрас у полі, хоць раней нават гусенічныя выцягваць з раллі часам прыходзілася. Аднойчы, кажуць, «Кіраўца» нават верталётам ратавалі, дадае **Аляксандр МАРКЕЧКА, намеснік дырэктара ААТ «Мурава»,** які быў нашым праважатым падчас усёй паездкі.

Добраўпарадкаванне, спорт і механізацыя

У вольны час паміж пасяўной і ўкосам у гаспадарцы сёлета заняліся «капітальным добраўпарадкаваннем». Мала таго што ўпрыгожылі тэрыторыю, дык яшчэ і ў майстэрнях паставілі тэнісны і більярдны сталы, ёсць дартс, шахматы ды шашкі. Тыя, хто не ходзіць на абед дахаты, адпачываюць тут. Тым больш што дырэктар «Муравы» ні цукру, ні гарбаты для работнікаў не шкадуе. Усё гэта купляецца ў агульнае карыстанне ў майстэрні ды на фермы.

Начальнік управлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні Пружанскага райвыканкама Алена ЛАПЫКА.

Добры адпачынак натхняе і на спартыўныя дасягненні. Па перацягванні канатаў камандзе гаспадаркі дагэтуль няма роўных. А мясцовая сандружына каторы год трымае першае месца ў раёне. Нават на спаборніцтвах па вобласці пазалетась яны таксама ўзялі першае месца, аднак адмовіліся ад яго, бо не было часу на ўдзел у рэспубліканскіх спартыўных баталіях.

Галоўны аграном ААТ «Мурава» Міхаіл ГАЎРА.

— У нашу сандружыну ўваходзіць шмат спецыялістаў, якія заўжды патрэбны на месцы. А на спаборніцтвы ў межах краіны трэба пару тыдняў. На такі час мы не маглі сабе дазволіць кінуць гаспадарку, — растлумачыў **Віталь БЕРАЗНЮК, загадчык рамонтных майстэрняў.**

У майстэрнях працуе шмат тых, хто прайшоў праз мясцовы каледж. Загадчык, напрыклад, таксама яго выпускнік, пачаў работу ў гаспадарцы яшчэ з вучэбнай практыкі.

Яўген ШУМСКІ, студэнт 4-га курса каледжа, адзін з цяперашніх практыкантаў, вучыцца на тэхніка-механіка. Калі не падасца атрымліваць вышэйшую адукацыю, плануе застацца на работу тут:

— Стаўленне добрае. Нам даверяюць розныя работы, што датычацца рамонту сельскагаспадарчай тэхнікі, многаму вучымся тут як памочнікі слесара.

Сяргей МАРОЗ, інжынер па забеспячэнні, працуе ў гаспадарцы з зімы. Сам ён мясцовы, пасля каледжа ў Пінску скончыў сельгасакадэмію ў Горках. Але вярнуўся на радзіму.

— Дадому цягне. Тут усё звыкла, і работа неблагая, і калектыў добры, усе знаёмыя, — тлумачыць ён.

— Яны тут падтрымаюць нешта, там падкажуць, і ўжо ў яго ў памяці нешта застанецца, і будзе навука, што з чаго складаецца, — заўважае загадчык майстэрняў.

Малако ды сенажаці, зубры ды бабры...

Па традыцыі, вырашылі крыху павандраваць па гаспадарцы і зазірнуць у знаёмыя мясціны. На шляху да малочнатаварнага комплексу «Мурава», які каторы год застаецца адным з найлепшых ва ўсім Пружанскім раёне, едзем па ўскрайку лесу. Непадалёк на полі працуюць два трактары, пакідаючы за сабой слуп пылу. Рыхтуюць глебу пад сяўбу кукурузы. Гэта бадай што апошнія работы, якія засталіся ў гаспадарцы.

Сцежак паміж палямі, дарэчы, з часам у гаспадарцы ўсё меншае, а плошча ворных зямель павялічваецца.

— Цяпер тэхніка шыроказахватная стала, таму мы аб'ядноўваем палі паміж сабой. У палёў стала большая контурнасць, а раней яны былі на кавалачкі разбітыя, — кажа Аляксандр Маркечка. *— Ды і абкошваць іх амаль не прыходзіцца праз гэта.*

У жывёлагадоўчым памяшканні малочнатаварнага комплексу «Мурава». Сярод працуючых — аператары машыннага даення Эвяліна ФЯДОТАВА (на здымку зверху) і Галіна РУДЧЫК (на здымку знізу).

Неўзабаве пад'ехалі да малочнага комплексу, статак якога за паўтара года з нашай апошняй сустрэчы павялічыўся да 1000 галоў, а на тэрыторыі з'явілася скульптура залатога цяляці. Як і раней, маладняк тут выпойваюць малодзівам, а абсалютна ўсё малако, якое выходзіць з фермы на малочныя камбінаты, мае вышэйшы клас — «экстра». З тутэйшай прадукцыі, дарэчы, будуць гатаваць «малочку» для спартсменаў Другіх еўрапейскіх гульняў.

— Пагалоўе кожнай групы кароў і рацыён для іх харчавання ўнесены ў праграму сучаснага аўтаматызаванага самаходнага трактара-кормараздатчыка, які на ферме замяніў свайго папярэдніка. Шустрая машына сама загружае сілас і развозіць яго па стойлах у патрэбнай колькасці тройчы ў дзень, — кажа **намеснік начальніка комплексу Святлана ЛЕНКАВЕЦ.**

На зваротным шляху нібыта на экскурсію трапілі. Наш гід Аляксандр Марчанка расказаў пра ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва, якое ў «Муравы» наладжана з лясніцтвам. Некаторыя калгасныя землі: ворныя і з лесам яшчэ гадоў дзесяць таму адышлі да Нацыянальнага парку Белавежская пушча. На частцы гэтай тэрыторыі адбываецца натуральнае забалочванне. Гаспадарчую дзейнасць тут вядуць толькі бабры, якія актыўна будуюць плаціны.

А вось на ўскрайках лесу, якія цяпер належаць пушчы, за сімвалічную плату мураўчане робяць сенажаці: самі засяваюць, самі скошваюць. А леснікі ведаюць, што тэрыторыя дагледжаная, так што ўсе ў выйгрышы. Праўда, намеснік дырэктара кажа, што, пэўна, летась апошні год засявалі.

— Цяпер тут будуць шматгадовыя травы расці, каб штогод глебу не пераворваць і не засейваць. Зубрам, якія ўладараць у пушчы, трава, дарэчы, не даспадобы, яны больш наш рапс любяць, — смяецца ён.

Літаральна праз хвіліну паказвае на сляды на полі пры дарозе: *«Алені прыходзілі шукаць ласункі, не далей як гадзіны чатыры назад. Тут летась кукуруза расла, вось яны і шукаюць рэшткі ў глебе». «А з другога боку дарогі вунь кабаны парыліся»,* — з веданнем справы кажа наш праважаты.

На гэтым наша чарговае падарожжа ў «Мураву» завяршаецца. А мясцовым застаецца пажадаць, каб хапала адукаваных спецыялістаў і... своечасовага дажджыку.

Добраўпарадкаванне тэрыторыі машыннага двара ў час суботніка.

Ірына СІДАРОК, Алена ДАЎЖАНОК, фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 200027333

УНП 807000255

ИНКАСС ЭКСПЕРТ

ГОДОВАЯ БУХГАЛТЕРСКАЯ (ФИНАНСОВАЯ) ОТЧЕТНОСТЬ

Закрытого акционерного общества «Небанковская кредитно-финансовая организация «ИНКАСС.ЭКСПЕРТ», составленная в соответствии с МСФО за 2018 год.

Годовая бухгалтерская (финансовая) отчетность в полном объеме, а также аудиторское заключение, составленное по результатам аудита годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности, опубликована на интернет-сайте www.incass-expert.by

Годовая консолидированная отчетность о деятельности банковского холдинга, в состав которого входит ЗАО «Небанковская кредитно-финансовая организация «ИНКАСС.ЭКСПЕРТ», размещается на интернет-сайте www.bps-sberbank.by

Отчет о финансовом положении за 2018 год

(в тыс. бел. руб.)

	Примечания	31 декабря 2018 года	31 декабря 2017 года
АКТИВЫ			
Денежные средства и их эквиваленты	6	48 407	49 185
Основные средства и нематериальные активы	7	2 695	1 931
Отложенные налоговые активы	8	116	55
Прочие активы	9	3 127	3 129
ИТОГО АКТИВЫ		**54 345**	**54 300**
ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ			
Обязательства			
Средства банков	10	47 103	47 354
Резервы под неоплаченные отпуска	11	132	92
Обязательство по текущему налогу на прибыль		-	-
Прочие обязательства	9	1 407	1 642
Итого обязательства		**48 642**	**49 088**
Капитал			
Уставный капитал	12	3 711	3 711
Накопленная прибыль / (убыток)		1 922	1 501
Итого капитал		**5 703**	**5 212**
ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ		**54 345**	**54 300**

Отчет о совокупном доходе за 2018 год

(в тыс. бел. руб.)

	Примечания	2018 год	2017 год
Процентные доходы	14	104	198
Процентные расходы	14	(61)	-
Чистые процентные доходы		**43**	**198**
Комиссионные доходы	15	906	649
Комиссионные расходы	15	(1 164)	(483)
Чистые комиссионные расходы		**(258)**	**166**
Чистые доходы / (убыток) по операциям с иностранной валютой	16	3	3
Чистый (убыток) по ценным бумагам		-	(3)
Доходы по инкассации		16 773	14 118
Доходы по перевозке		8 299	7 167
Прочие доходы	17	4 149	4 149
Итого операционные доходы		**29 009**	**25 798**
Операционные расходы	18	(27 274)	(23 864)
Прибыль до отражения расходов по налогу на прибыль		**1 735**	**1 934**
Расходы по налогу на прибыль	8	(744)	(895)
Прибыль / (убыток) за период		**991**	**1 039**
ИТОГО СОВОКУПНЫЙ ДОХОД (РАСХОД)		**991**	**1 039**

Отчет об изменениях в капитале за 2018 год

(в тыс. бел. руб.)

	Примечания	Уставный капитал	Накопленный убыток	Итого капитал
Остаток на 31 декабря 2016 года		**3 711**	**1 052**	**4 763**
Совокупный доход				
Прибыль за период		-	1 039	1 039
Операции с акционерами				
Дивиденды объявленные	12	-	(590)	(590)
Остаток на 31 декабря 2017 года	**12**	**3 711**	**1 501**	**5 212**
Влияние первого применения МСФО 9 на 1 января 2018 года		-	-	-
Совокупный доход				
Прибыль за период		-	991	991
Операции с акционерами				
Дивиденды объявленные	12	-	(500)	(500)
Остаток на 31 декабря 2018 года	**12**	**3 711**	**1 992**	**5 703**

Отчет о движении денежных средств за 2018 год

(в тыс. бел. руб.)

	Примечания	2018 год	2017 год
Денежные потоки от операционной деятельности		**104**	**199**
Проценты полученные		(61)	-
Проценты уплаченные		906	644
Комиссии полученные		(1 155)	(480)
Комиссии уплаченные			
Реализованный результат по операциям с иностранной валютой		**5**	**7**
Реализованный результат по операциям с ценными бумагами		**-**	**(3)**
Прочие операционные доходы		28 428	25 000
Уплаченные операционные расходы		(26 259)	(23 136)
Уплаченный налог на прибыль		(690)	(1 086)
Движение денежных средств, полученных от операционной деятельности до изменений в операционных активах и обязательствах		**1 278**	**1 145**
Чистое увеличение операционных активов / обязательств			
Средства в банках		-	2 740
Прочие активы		1	(399)
Средства банков		(251)	12 118
Средства клиентов		-	-
Прочие обязательства		(236)	171
Чистые денежные потоки от операционной деятельности		**792**	**15 775**
Денежные потоки от инвестиционной деятельности			
Приобретение основных средств и нематериальных активов	7	(1 425)	(308)
Чистое расходование денежных средств от инвестиционной деятельности		**(1 425)**	**(308)**
Денежные потоки от финансовой деятельности			
Выплата дивидендов	12	(500)	(590)
Получение / (погашение) прочих займов			
Чистое расходование денежных средств от финансовой деятельности		**(500)**	**(590)**
Чистое увеличение денежных средств и их эквивалентов		**(1 133)**	**14 877**
Влияние изменений обменных курсов на денежные средства и их эквиваленты		355	159
Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода	**6**	**49 185**	**34 149**
Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода	**6**	**48 407**	**49 185**

Председатель Правления Э.Г. Гонтарь

Главный бухгалтер Е.М. Грибанова

Дата подписания: 28.02.2019

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5
Продавец	ОАО «СМТ № 41» г. Сморгонь, Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Гагарина, д. 24

Предмет аукциона

Наименование	Назначение	Инвентарный номер	Общая площадь	Адрес
Навес арматурный	Здание нежилое	443/С-14639	1123,2 кв. м	Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, д. 34

Сведения о земельном участке: предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания навеса арматурного, пл. 0,1401 га.

Начальная цена с НДС 20 % – 174 000,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390.

Срок подписания договора купли-продажи: 5 рабочих дней после проведения аукциона.

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти) календарных дней** после заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

Аукцион состоится 21.06.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 19.06.2019 до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by. Email: auction@cpo.by

---

Государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» сообщает о снятии с торгов по продаже имущества ОАО «Кожевник», назначенных на 21.05.2019, лота № 26. **Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63.** УНП 390477566

ООО «Реалконсалтинг» сообщает об отмене проведения повторного аукциона № 63/19, назначенного на 28.05.2019, по продаже лота № 1– «Изолированное помещение с инвентарным номером 200/D-155941». *Извещение о повторном аукционе № 63/19 опубликовано в газете «Звязда» от 27.04.2019.* УНП 191302068

Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РП, 2РН (серия БА), № № 1299638, 1537041 **считать недействительными.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Торфопредприятие «Колпеница»

ПРЕДМЕТЫ АУКЦИОНА

Лот № 2

1) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-88809 (наименование – главный корпус брикетного завода с бытовыми помещениями; назначение – здание специализированное иного назначения), площадью 1204,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 120480402101000013, площадью 7,6687 га, по адресу: Брестская обл., Барановичский р-н, Великолукский с/с, 17, 0,7 км северо-восточнее п. Кабушкина;

2) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-88801 (наименование – склад готовой продукции; назначение – здание специализированное складов, хранилищ), площадью 192,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 120480402101000013, площадью 7,6687 га, по адресу: Брестская обл., Барановичский р-н, Великолукский с/с, 17/2, 0,7 км северо-восточнее п. Кабушкина;

3) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-88820 (наименование – автовесовая; назначение – здание специализированное иного назначения), площадью 67,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 120480402101000013, площадью 7,6687 га, по адресу: Брестская обл., Барановичский р-н, Великолукский с/с, 17/1, 0,7 км северо-восточнее п. Кабушкина.

Начальная цена, руб. (с учетом НДС)	76 577,55	Задаток, руб.:	7 657,76

Лот № 3

1) Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-88800 (наименование – магазин; назначение – здание специализированное розничной торговли), площадью 149,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 120480402101000022, площадью 0,0219 га, по адресу: Брестская обл., Барановичский р-н, Великолукский с/с, п. Кабушкина, ул. Заводская, 6.

Начальная цена, руб. (с учетом НДС)	1 677,58	Задаток, руб.:	167,76
Условия продажи	Без условий		
Организатор аукциона	Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»		
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона		
Условия оплаты	В соответствии с заключенным договором купли-продажи		
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245		

Аукцион состоится 30 мая 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325.

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, можно узнать у организатора аукциона по телефонам 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81, 8-(029) 626-72-52.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.

Последний день приема заявлений – 29 мая 2019 г. до 17.00.

**** Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает возмещение затрат Организатору аукциона.***

**** Ранее извещение о продаже имущества ОАО «Торфопредприятие «Колпеница» опубликовано в газете «Звязда» от 23.03.2019 г.***

Островшицкий сельский исполнительный комитет (организатор аукциона) извещает о проведении 19 июня 2019 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь (га)	Ограничения в использовании, инфраструктура	Начальная цена (бел. рублей)	Размер задатка (бел. рублей)	Расходы по изготовлению документации (бел. рублей)
1	д. Чуденичи, ул. Строительная, 3, кадастровый номер 623286308101000358	0,1190	Черта населенного пункта. Имеются сети: электрификация, водоснабжение, газификация	12 000,00	1200,00	234,60 + расходы за размещение объявления

Дата, время и место проведения аукциона: 19 июня 2019 в 10.00 по адресу: Логойский район, аг. Островшицы, ул. Центральная, д. 8, Островшицкий сельский исполнительный комитет.

Прием документов, ознакомление с участком и документацией: ежедневно с 8.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) по 13.06.2019 включительно; к заявлению прилагается квитанция об оплате задатка и копия личного паспорта.

Задаток перечисляется на расчетный счет BY37AKBB36006191411050000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНН 600537220, код платежа – 04901, получатель – Островшицкий сельский исполнительный комитет.

Условия: победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

Конт. тел.: (801774) 57 6 21, 57 6 35, 57 6 36; (+37529) 366 76 48.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры»

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Лот 1: капитальное строение, инв. № 401/С-27447 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина «Мебель и техника в быту»), общей площадью 680,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Ленина, 74.

Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый № 422050400002002567, площадью 0,0984 га (назначение – для обслуживания здания магазина «Мебель и техника в быту»), расположенном по адресу: г. Скидель, ул. Ленина, 74.

Начальная цена продажи – 200 000 р. (двести тысяч рублей) с учетом НДС.

Сумма задатка – 20 000 р. (двадцать тысяч рублей).

Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74.

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38.

Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225.

Аукцион состоится 31 мая 2019 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 08.02.2019 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.

Последний день приема заявлений – 28 мая 2019 г. до 15.00.

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

ОАО «БНБ-Банк»

220012, Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 87а.

Консолидированный бухгалтерский баланс на 1 января 2019 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2018	2017
1	2	3	4	5	6
1	АКТИВЫ				
2	Денежные средства	1101		11 213	10 921
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	5	46 357	38 194
5	Средства в банках	1104	6	47 980	38 570
6	Ценные бумаги	1105	7	55 086	56 738
7	Кредиты клиентам	1106	8	342 306	298 542
8	Производные финансовые активы	1107	9	4 538	204
9	Инвестиции в зависимые юридические лица			-	-
10	Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица			-	-
11	Долгосрочные финансовые вложения	1108	10	57	-
12	Основные средства и нематериальные активы	1109	11	18 334	27 477
13	Доходные вложения в материальные активы	1110	12	12 514	-
Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62

СТАРЭЦЬ НЕ АБАВЯЗКОВА!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Зараз тэхнічны прагрэс і дасягненні медыцыны дазваляюць чалавеку жыць доўга. Але як быць у старасці, калі баляць суставы, зрок і слых не вельмі добрыя, калі галава кружыцца, ад чаго паходка робіцца хісткай і ўзнікае рызыка падзення? Тут трэба разумець, што колькасць захворванняў не ўплывае на якасць жыцця. Нават калі чалавек мае пэўныя хваробы, але прыхільны да лячэння, адэкватна ацэньвае свае сілы і правільна размяркоўвае фізічную нагрузку, не шкодзячы сваім суставам і пазваночніку, ён можа жыць доўга і паўнацэнна. Калі ёсць праблемы са страўнікава-кішачным трактам, але ён правільна харчуецца, то і з гэтымі захворваннямі ён можа жыць. Таму трэба сябе максімальна берагчы, каб у старасці быць незалежным.

— Як інтэнсіўная фізічная праца ці спорт уплываюць на працягласць жыцця?

— Гэта той фактар, які з аднаго боку спрыяе даўгалецціу, а з іншага, неразумнае выкарыстанне яго шкодзіць арганізму. Многія людзі ацэньваюць свае сілы неадэкватна — даюць нагрузкі, якія перавышаюць іх магчымасці. Рэсурс рана ці позна заканчваецца, бо ў кожнай сістэмы свая ступень трываласці. Хтосьці ўсю зіму адпачываў, мала рухаўся, а потым прыехаў на дачу і вырашыў за дзень пасадзіць 20 сотак. Нічым добрым для арганізма гэта не скончыцца. Зараз той перыяд, калі дачнікі, якія цэлую зіму правялі дома, імкнуцца на прысядзібныя ўчасткі і даюць сабе непасільную нагрузку. І мы маем вялікую колькасць інсультаў, інфарктаў і іншых захворванняў. Увогуле, як паказвае вопыт, большасць з нас стараецца перавышаць свае магчымасці і рэсурсы. Але трэба і берагчы сябе.

— Дык здаецца, што можа быць лепш у гэтым плане, чым адпачываць усю зіму?

— Ёсць простыя правілы таго, як правільна варта сябе захоўваць, і кожны ў стане іх прытрымлівацца. Зразумела, што мы не можам не нервавацца, бо сённяшняе жыццё напоўнена стрэсамі. Але ёсць тое, што кожнаму па сілах: у тыдзень трэба мець 150 хвілін аэробнай нагрузкі, якая дае перавышэнне пульсу на 40—50 %. І яе трэба выконваць любым шляхам, безумоўна, з улікам сваіх праблем са здароўем. Каб правільна яе падабраць, трэба пракансультавацца з урачом. Зразумела, гэта не статычная нагрузка, калі вы падымаеце штангу, бо з гадамі ваш спрасаваны пазваночнік болем напомніць пра ўсё. Карыснымі могуць быць расцяжка, ёга, інтэнсіўная хадзьба, плаванне.

Важна, каб у штодзённым рацыёне была пэўная прапорцыя расліннай ежы. Акцэнт трэба рабіць не на бялковай, цяжказасваяльнай ежы. З раніцы лёгказасваяльныя вугляводы — кашы, у абед і на працягу дня — вялікая колькасць гародніны і фруктаў. Усе калорыі, якія вы на працягу дня з'елі, трэба пастарацца разгрузіць.

Калі ваша работа сядзячая і цэлы дзень вы праводзіце за камп'ютарам, трэба памятаць, што перыядычна вам неабходна фізічная нагрузка, хоць бы зарадка, каб з вымушанай позы вы ўставалі, разгружалі суставы і давалі магчымасць аднавіцца кровазабеспячэнню ўсіх органаў і сістэм. У савецкія часы нездарма існавала вытворчая гімнастыка, пра якую зараз зноў пачалі гаварыць.

— Калі праца не разумовая, а цяжкая фізічная, таксама патрэбна дадатковая актыўнасць?

— Як вядома, змена дзейнасці і ёсць адпачынак. Калі ў вас цяжкая фізічная праца, не трэба дадаткова нагружаць суставы і вены фізічнымі практыкаваннямі. Знайдзіце рэлаксуючы занятак — ёга, расцяжка. Калі падчас фізічнай працы нагрузка, напрыклад, прыходзіцца на ногі, трэба даць ім адпачынак, але задзейнічаць плечавы пояс. Калі ж вы заняты разумовай працай, 150 хвілін аэробнай нагрузкі ў тыдзень недастаткова, гэты час пажадана павялічваць. Калі ваша работа з высокай ступенню стрэсу, гэты адрэналін нішто не разбурае лепш, чым фізічная нагрузка. Калі вы шмат сядзіце, важна паступова, без рэзкіх скачкоў, прыступаць да практыкаванняў. Увогуле жанчынам ва ўзросце я б не рэкамендавала хадзіць на аэробіку, гэта і ёсць перавышэнне магчымасцяў свайго арганізма. Лепш падыходзяць хадзьба, скандынаўская хадзьба, дзе задзейнічаны і плечавы пояс, практыкаванні на падлозе, дзе вы выпрастоўваеце свой пазваночнік.

— Як наш настрой уплывае на здароўе? Доўгажыхары — гэта аптымісты?

— Адназначна. Я не бачыла сярод доўгажыхароў песімістаў. Пазітыўнае мысленне — адно з правіл даўгалецця. Шмат залежыць ад нашага мозга: калі хтосьці вырашыў, што ён стары, у яго запускаецца працэс паталагічнага старэння. Таму, калі мы глядзімся ў люстэрка, лепш казаць сабе добрыя словы. І свет успрымаць пажадана не ў цёмных фарбах, а знаходзіць нейкую яркую, каляровую рысу і на ёй засяроджваць сваю ўвагу, навучыцца радавацца жыццю.

— Якія агульныя рысы характэрныя для доўгажыхароў?

— Гэта людзі, умудроныя жыццёвым вопытам, яны ўспрымаюць усё не так востра і эмацыйна, як гэта ўласціва моладзі. Яны з разуменнем ставяцца да недахопаў іншых, досыць крытычна адносяцца да ўласнай персоны, але не моцна цкуюць сябе за нейкія пралікі ў жыцці. Гэта людзі, занятыя пастаяннай фізічнай працай ці актыўнасцю: нехта наведвае спартыўную залу, а іншы проста штодзень ходзіць, хтосьці мае дачу, дзе працуе, ці жыве ў агульным з блізкімі доме і мае свае абавязкі. Але ўсе гэтыя людзі любяць фізічную працу ў залежнасці ад той ступені, у якой дазваляе арганізм. Яны маюць пазітыўнае мысленне і заняты самаадукацыяй. Тут неабавязкова штурмаваць навуковыя вышыні, дастаткова цікавіцца жыццём, атрымліваць любыя новыя веды. Можаце асвойваць тое, чым вы калісьці цікавіліся, калі ў вас было ў планах нечым заняцца — займіцеся зараз. Любы разумовы працэс толькі на карысць.

Сёння шмат тэорый даўгалецця, сярод іх генетычная, якая сцвярджае, што працягласць жыцця залежыць ад даўжыні нашых целамераў — гэта пэўныя генетычныя ўтварэнні. У кожнага іх даўжыня індывідуальная. Калі іх адкрылі і супаставілі з працягласцю жыцця, меркавалася, што ў кожнага маецца свой парог. Пасля высветлілася, што нашы целамеры на працягу жыцця могуць мяняцца. І калі прысутнічаюць такія фактары рызыкі, як курэнне, алкаголь, гіпадынамія, то целамеры імкліва скарачаюцца, нават калі яны былі доўгія і прырода дала шанц. Калі вы змяняеце свой лад жыцця, пачынаеце даваць сабе фізічную нагрузку, рэгуляваць харчаванне, калі вы ўсмешлівы чалавек і радуецеся кожнаму дню, дорыце цеплыню сваім блізкім, усё гэта толькі павялічвае целамеры, і яны вяртаюцца ў той біялагічны стан, які быў закладзены прыродай. Нішто не праходзіць бясследна: усё добрае падаўжае наша жыццё, а дрэннае — скарачае.

— Наяўнасць сям'і, блізкіх падаўжае жыццё?

— Ёсць такое паняцце ў герыятрыі, як сацыяльныя сіндромы. Адзінота — найбольш значны з іх. І найбольш уплывовы для мужчын. Жанчыны больш гнуткія, яны, як правіла, знаходзяць сабе занятак. На сёння сярэдняя працягласць жыцця мужчын у Беларусі на 10 гадоў менш, чым жанчын. Калі мужчына застаецца без блізкіх ва ўразлівым да развіцця сардэчна-сасудзістых катастроф узросце — з 40 да 60 гадоў, у тым ліку і адзінота правакуе смяротнасць. Гэта вельмі добра, калі пажылыя людзі аб'ядноўваюцца ў пары. Сёння дзеці рэдка жывуць з пажылымі бацькамі, і важна, калі побач са сталым чалавекам нехта ёсць. Да таго ж у адзінокага чалавека ўзрастае імавернасць дэпрэсіі, што з'яўляецца важным фактарам заўчаснай смяротнасці. Гэтае расстройства спрыяе развіццю ў тым ліку і сардэчна-сасудзістых катастроф.

— Колькі гадоў вы працуеце з пажылымі людзьмі? Якія высновы для сябе зрабілі?

— Усю сваю працоўную дзейнасць, а гэта амаль 40 гадоў, я займаюся людзьмі, у тым ліку і пажылымі, пэўны час працавала галоўным герыятрам Міністэрства аховы здароўя. Ужо тры гады дзейнічае наш цэнтр. На мой погляд, сёння наспела неабходнасць распрацоўкі на дзяржаўным узроўні праграмы, скіраванай на пажылых людзей. Наша насельніцтва старэе. Сёння гэта цэлы пласт грамадства, які патрабуе іншых падыходаў. Павінна мяняцца гарадское асяроддзе: нашы паркі, пляцоўкі мусяць быць не толькі для дзяцей, але і для пажылых, дзе яны змогуць забяспечваць камунікацыю і фізічную нагрузку. У грамадстве мы павінны папулярызаваць паняцці валанцёрства і міласэрнасці.

Калі казаць пра ўласныя назіранні, я зразумела, што ў сваёй свядомасці ніколі не трэба ставіць псіхалагічныя перашкоды адносна ўзросту. У пэўны момант мы сабе кажам: мне ж ужо 60, я гэтага ўжо не здолею ці не павінен рабіць. А трэба казаць, што нягледзячы на тое, што ўзрост уносіць пэўныя абмежаванні, штосьці іншае я магу рабіць лепш. Мне падабаецца выказванне «старэць не абавязкова». Усё ж пачынаецца ў нашай галаве.

— Чаму вы вучыце пажылых людзей у геранталагічным цэнтры?

— Найперш таму, што неабходна выконваць кожнаму пажылому чалавеку: кантраляваць асноўныя паказчыкі свайго здароўя. Правільна вымяраць артэрыяльны ціск, арыентавацца на дозы і прэпараты, каб яго знізіць. Калі павышаны аб'ём таліі і ёсць рызыка ўзнікнення цукровага дыябету ці ён ужо развіўся — кантраляваць узровень глюкозы. Вучым, як правільна хадзіць, каб пазбегнуць падзенняў, калі ёсць галавакружэнні. Тлумачым, як палепшыць памяць, як заўважыць, што ўзніклі з ёй праблемы, як арганізаваць бяспечную прастору дома, якія маркеры пакінуць, каб, выходзячы з кватэры, звярнуць увагу, ці выключыў ты газ. Расказваем, як дзейнічаць, калі ўзніклі болі ў сэрцы, як правільна сфарміраваць аптэчку — каб не ўзнікала панікі ў такіх сітуацыях. Ёсць шмат забаўляльных і пазнавальных мерапрыемстваў, напрыклад музычная тэрапія ці кірмашы рэчаў, зробленых уласнымі рукамі.

— Людзям якога ўзросту вы параілі б геранталагічны цэнтр?

— Працэсы старэння пачынаюцца ў нашым арганізме з 45 гадоў, спачатку незаўважна для нас самих. Мы пачыналі з 60-гадовых пацыентаў. Зараз запрашаем людзей і ў 50, калі бачым, што чалавек зношаны маральна і фізічна. Я гляджу пацыентаў на этапе прыёмнага пакоя нашага шпіталя. Нярэдка бачу там сталых людзей з апушчанымі плячыма, з патухлым поглядам, у якіх няма жадання ні з кім кантактаваць. І кажу ім: «Прыходзьце у цэнтр!». Праз нейкі час сустракаю ў калідоры, іх не пазнаць — вочы загараюцца, вяртаецца цікавасць да жыцця!

Алена КРАВЕЦ.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже здания основного корпуса, принадлежащего ОАО «Несвижский завод медицинских препаратов» (Продавец)

Лот № 1. Здание основного корпуса с инв. № 621/С-14517, 1901 г. п. Адрес: Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, п. Альба, ул. Заводская, 1/1. Площадь – 1 322,70 кв. м. ***Начальная цена с НДС – 25,50 бел. руб. Задаток – 25,50 бел. руб.*** **Шаг аукциона 5 %.** Земельный участок площадь 0,1541 га, кадастровый номер 624283500601000179.

Обременения: 1. Статус: историко-культурная ценность (паспорт от 15.08.2013); 2. Аренда: 102,31 кв. м по 31.12.2020; 14,70 кв. м по 31.12.2020.

Аукцион состоится 31.05.2019 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, полный перечень обременений, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 31.05.2019 (ОАО «Несвижский завод медицинских препаратов», Лот № 1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 29.05.2019 в 11.00. Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 25.08.2018.

☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

Центр Промышленной Оценки • Организация аукционов • Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Калинковичский мясокомбинат», Гомельская обл., г. Калинковичи, ул. Северная, 8
Предмет аукциона Месторасположение: Гомельская обл., Калинковичский р-н, Липовский с/с, аг. Липов, ул. Советская, 26	

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер
Здание комплексного приемного пункта	161,4 кв. м	333/С-24121

Сведения о земельном участке: пл. 0,0415 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания комплексного приемного пункта.

Начальная цена с НДС 20 % – 15 660,05 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона.

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 09.02.2019.

Аукцион состоится 21.06.2019 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 19.05.2019** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42.
www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

Извещение о проведении 18 июня 2019 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк». Сведения о продаваемом имуществе

Номер предмета торгов	Информация о предмете торгов	Стартовая цена, руб.	Размер задатка, руб.
1	Объект недвижимости: - капитальное строение с инвентарным номером № 600/С-33, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Острошицко-Городокский с/с, д. Раубичи, д. 2А, кв. 1, площадь – 509,8 кв. м, назначение – здание блокированного жилого дома, наименование – жилой дом; - капитальное строение с инвентарным номером № 600/С-32, расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Острошицко-Городокский с/с, д. Раубичи, д. 2А, кв. 2, площадь – 235,4 кв. м, назначение – здание блокированного жилого дома, наименование – жилой дом. Объект недвижимости расположен на двух земельных участках с кадастровыми номерами: 623685206601000207 (площадь: 0,1922 га), 623685206601000208 (площадь: 0,2002 га)	1 511 660,24 (один миллион пятьсот одиннадцать тысяч шестьсот шестьдесят белорусских рублей, 24 копейки)	15 116,60 (пятнадцать тысяч сто шестнадцать рублей, 60 копеек)
Примечание	Объект недвижимости реализуется без технического паспорта. Выдана ведомость технических характеристик от 30.10.2018 со следующими замечаниями: отсутствуют признаки блокированного жилого дома (дом представляет собой одноквартирный жилой дом, в котором все внутренние помещения имеют сообщение между собой); ранее зарегистрированный сарай (литер 2) находится за пределами границ земельного участка. Расходы по получению технического паспорта на объект недвижимости возлагаются на кандидата в правообладатели		

Продавец имущества: открытое акционерное общество «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.

Организатор аукциона: консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт», 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, оф.1703.

Торги проводятся в форме открытого аукциона в соответствии со ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и условиями проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк».

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет консалтингового унитарного предприятия «Агробизнесконсалт» № BY23BAPB30122013100380000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X, УНП 190982374, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном условиями проведения торгов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение **90 календарных дней** со дня проведения аукциона.

Торги проводятся 18 июня 2019 года в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Веры Хоружей, д. 22, оф. 1703

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 18.05.2019 по 14.06.2019 включительно, в рабочие дни с 08.30 до 12.30 и с 13.15 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, оф. 1703.

Получить дополнительную информацию и ознакомиться с документацией по условиям и предметам торгов можно на сайте www.zalogbanka.by, mail: torgi@agroconsult.by

Телефоны для справок: организатор аукциона: Tel/Fax 8 (017) 399 66 39, GSM MTS 8 (029) 816-64-46, GSM VEL 8 (044) 540-64-46.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 412/С-26429 (назначение – здание специализированное культурно-просветительского и зрелищного назначения, наименование – здание клуба), общей площадью 188,8 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Лунненский с/с, д. Мешетники, 60Б.

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424082707301000123, площадью 0,1116 га (назначение – для обслуживания здания клуба), расположенном по адресу Мостовский р-н, Лунненский с/с, д. Мешетники, 60Б. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2.4, площадью 0,0826 га; земли в прибрежных полосах рек и водоемов, код 2.5, площадью 0,0290 га; земли в охранных зонах электрических сетей, код 5.2, площадью 0,0047 га.

Начальная цена продажи – 5 520 р. (пять тысяч пятьсот двадцать рублей) с учетом НДС.

Сумма задатка – 552 р. (пятьсот пятьдесят два рубля).

Продавец – ОАО «Черлена», 231606, д. Лунно, пл. Героев, 4, тел. 8-01515-281-25.

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32, 45-05-38.

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225.

Аукцион состоится 31 мая 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 23.01.2019 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.

Последний день приема заявлений – 28 мая 2019 г. до 15.00

Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/

К@нтыненты

РЭХА НОТР-ДАМА

Як знішчаюцца гістарычныя каштоўнасці?

Больш чым праз месяц пасля пажару, які без перабольшвання ўзрушыў увесь свет, Нацыянальны сход Францыі прыняў законапраект аб аднаўленні Нотр-Дама дэ Пары. Тэкст ратыфікуе адкрыццё нацыянальных ахвяраванняў і прадугледжвае, што ўсе яны будуць перададзеныя дзяржаве або дзяржаўнай установе. Спрэчкі па тэксце насамрэч гістарычнага закона працягваліся 13 гадзін, паведаміла BFMTV. Цяпер дакумент накіраваны ў сенат для галасавання, якое прызначана на 27 мая. Нотр-Дам як сімвал Францыі і знакавы аб'ект сусветнай культурнай спадчыны безумоўна заслугоўвае такой увагі. Многім яго «калегам» пашанцавала менш. Як знішчаюцца гістарычныя каштоўнасці?

Німруд, Пальміра, Тамбукту

Старажытны горад Німруд на поўначы Ірака быў разбураны баевікамі тэрарыстычнай арганізацыі «Ісламская дзяржава» ў сакавіку 2015 года. Па звестках Бі-бі-сі, знішчана 95 працэнтаў старажытных артэфактаў, уключаючы вырабы са слановай косткі, статуі крылатых божастваў ламасу, рукапісы старажытных дагавораў. Німруд, згаданая ў Бібліі сталіца Асірыйскай імперыі, быў заснаваны ў XIII стагоддзі да нашай эры. Горад з тысячагадовай гісторыяй, які апошнія 150 гадоў прыцягваў увагу археолагаў з усяго свету, быў знішчаны за адну ноч. Эксперты ЮНЕСКА назвалі разбурэнне Німруда ваенным злачынствам, і ўрад Ірака быў вымушаны звярнуцца па дапамогу да міжнароднай супольнасці.

Улетку 2015 года ў сірыйскім горадзе Пальміра тэрарысты пашкодзілі храм Баалшаміна, знішчылі храм Бела, калекцыю статуй і 15-тонную постаць льва Алата, якая ўпрыгожвала ўваход у гарадскі музей. У кастрычніку таго ж года баевікі ІД узарвалі Трыумфальную арку — самы вядомы помнік Пальміры. Спецыялісты ЮНЕСКА ў сакавіку 2016-га адправілі фрагменты статуі льва Алата ў Дамаск, дзе праз два месяцы карпатлівай працы рэстаўратары аднавілі фігуру. Улады Сірыі спадзяюцца зноў адкрыць Пальміру для турыстаў у найбліжэйшы час. Эксперты мяркуюць, што храм Баалшаміна, Трыумфальную арку і нават амаль цалкам знішчаны храм Бела магчыма аднавіць.

Грабніцы сямі суфійскіх святых у старажытным ісламскім цэнтры Тамбукту ў Малі разграмілі ў 2012 годзе тэрарысты з групоўкі «Ансар-ад-Дын». Акрамя таго, баевікі сарвалі вароты мячэці Сядзі Ях'я і знішчылі больш за чатыры тысячы старажытных рукапісаў, што захоўваліся ў Горадзе 333 святых. Праз тры гады арганізатар тэракта быў арыштаваны і перададзены Гаагскаму суду. Гэта першы ў гісторыі працэс па абвінавачванні ў разбурэнні помнікаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Па яго выніках суд прыгаварыў тэрарыста да дзевяці гадоў пазбаўлення волі і абавязаў выплаціць кампенсацыю ў памеры 2,7 мільёна еўра. Прадстаўнікі ЮНЕСКА абвясцілі, што разам з Еўрапейскім саюзам дапамогуць у аднаўленні страчаных каштоўнасцяў і культурнай спадчыны Малі.

У 2001 годзе велічэзныя статуі Буды ў Афганістане ўзарвалі экстрэмісты руху «Талібан». Фігуры былі высечаны ў скалах, што акружаюць Баміянскую даліну, прыблізна ў VI стагоддзі. У 2002 годзе, пасля звяржэння рэжыму талібаў, тагачасны прэзідэнт Афганістана Хамід Карзай паабяцаў аднавіць статуі. Была праведзена кансервацыя фрагментаў, якія захаваліся. Работы па аднаўленні пакуль не пачыналіся, у тым ліку праз недахоп сродкаў, нестабільнасць у Афганістане і рознагалоссі аб тым, ці дапушчальна аднаўляць старажытныя статуі з сучасных матэрыялаў. Між тым шэраг спецыялістаў лічаць, што вярнуць страчанае наўрад ці ўдасца.

Геогліфы ці ралі?

У маі 2013 года Нох-Мул, самую высокую піраміду ў Белізе, знішчылі будаўнікі. Збудаванне, узведзенае мая дзве тысячы гадоў назад, знеслі, каб здабыць друз для будаўніцтва дарогі. Кіраўнік мясцовага інстытута археалогіі Хайме Эйв пацвердзіў: рабочыя ведалі, што руйнуюць гістарычны помнік. 30-метровая піраміда Нох-Мул знаходзілася ў цэнтры прыватнай трысняговай плантацыі, аднак пабудовы дакалумбавай эпохі ахоўваюцца законам і не могуць быць знесены па рашэнні ўласніка зямлі, на якой размешчаны. Археолагі заявілі, што аднавіць піраміду немагчыма. Па словах навукоўцаў, бяскарнае знішчэнне старажытных збудаванняў дзеля здабычы друзу не рэдкасць у Белізе.

У 2013 годзе ў сталіцы Перу — Ліме — знеслі шасціметровую піраміду, каб расчысціць пляцоўку пад элітную забудову. Паліцыя паспела прадухіліць знішчэнне астатніх трох будынкаў. Ансамбль з чатырох пірамід, які служыў рэлігійным і адміністрацыйным цэнтрам інкаў, быў пабудаваны каля чатырох тысяч гадоў таму. Кіраўнік даследчага праекта El Paraiso заявіў, што будаўнічыя кампаніі, якія санкцыянавалі знос піраміды, «нанеслі непапраўную шкоду перуанскай гісторыі. Мы ніколі не даведаемся, як і з чаго гэтыя будынкі былі пабудаваны і як тут жылі людзі».

У 2007 годзе 10 старажытных магільняў у горадзе Нанкін у Кітаі разбурылі па распараджэнні прыватнай кампаніі. На пляцоўцы, дзе будавалася крама IKEA, былі выяўлены пахаванні з зялёнай цэглы, аздобленыя лотасам і старадаўнімі гравюрамі. Меркаваны некропаль адносіўся да 220—589 гадоў, эпохі Шасці дынастый. Нягледзячы на шматлікія просьбы вучоных даследаваць выяўленыя артэфакты, рабочыя проста разраўнялі знаходку разам з пляцоўкай пад будынак. Па кітайскіх законах штраф за знішчэнне культурных каштоўнасцяў складае ад 50 тыс. да 500 тыс. юаняў (ад 7,2 тыс. да 72 тыс. долараў), што не спыняе буйныя карпарацыі.

Гістарычныя помнікі Чылі штогод гінуць пад коламі пазадарожнікаў ралі «Парыж — Дакар». У 2009 годзе з прычыны тэрарыстычнай пагрозы гонку перанеслі з Еўропы ў Паўднёвую Амерыку. З тых часоў чылійскі ўрад спрачаецца з археолагамі і эколагамі пра тое, наколькі прыбытак ад турыстычнага бізнесу важнейшы за захаванне гістарычных каштоўнасцяў. Падчас ралі руйнуюцца геогліфы (нанесеныя на зямлі маштабныя малюнкі), пахаванні і сцежкі інкаў, гістарычныя артэфакты. Даследаванні камітэта па нацыянальных помніках сведчаць аб тым, што ў 2011 годзе была пашкоджана амаль палова з 283 аб'ектаў, якія ахоўваюцца. Абараніць сваё меркаванне легальным шляхам праціўнікі ралі не змаглі — канстытуцыйны суд не падтрымаў пазіцыю чылійскай асацыяцыі археолагаў. І сёлета ралі прайшло па ранейшым маршруце.

Базіліка супраць землятрусу

У 2016 годзе серыя моцных землятрусаў у Цэнтральнай Італіі сур'ёзна пашкодзіла будынкі XIII стагоддзя. Стыхія цалкам знішчыла сярэднявечны горад Аматрычэ. У горадзе Норчэ аказаліся разбураныя званіца гарадской ратушы, будынак мэрыі і базіліка Святога Бенедыкта, ад якой застаўся толькі фасад. Паводле легенды, базіліка была ўзведзена над домам, дзе нарадзіўся святы. Адгалоскі землятрусу адчуваліся ў Рыме, дзе на сценах сабора Святога Паўла і царквы Сант-Эўстакіа з'явіліся расколіны. Урад Італіі, духавенства і мецэнаты заявілі, што загінулыя помнікі будуць адноўлены.

У красавіку 2015 года землятрус разбурыў дзевяціпавярховую вежу Дхарахара з вінтавой лесвіцай — галоўную славутасць Катманду. Вежа вышынёй 61,8 метра была пабудавана ў 1832 годзе па загадзе каралевы Трыпурасундары. На дзявятым паверсе вежы размяшчаўся храм Шывы, на восьмым — назіральная пляцоўка. Дхарахара ўваходзіла ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. У цэнтры горада былі знішчаны храмы Нараяна і Маджа, а на ўскраіне часткова пашкоджаны Малпін храм (Сваямбунатх). Акрамя таго, ад землятрусу сур'ёзна пацярпелі шэсць манастыроў Каг'ю — адной з чатырох школ будызму. Над аднаўленнем загінулых помнікаў разам з дэпартаментам археалогіі і Нацыянальным музеем Непала працуе каманда спецыялістаў ЮНЕСКА.

Знакаміты Пражскі заапарк сур'ёзна пацярпеў падчас паводкі. Стыхійнае бедства 2002-га эксперты прызналі самым моцным за апошнія 500 гадоў. У пражскай галерэі сучаснага мастацтва Кампа, размешчанай у гістарычным цэнтры горада, затапіла экспанаты на першым паверсе будынка, з-за чаго адкрыццё экспазіцыі было адкладзена на год. Горад-крэпасць Тэрэзін, затоплены падчас паводкі, удалося аднавіць за два гады. У горадзе Пісек стыхія сур'ёзна пашкодзіла парэнчы найстарэйшага ў Чэхіі гатычнага каменнага моста. Грошы на рэстаўрацыю збіралі па ўсёй краіне і за мяжой. Мост рэканструявалі і ўмацавалі так, каб ён вытрымаў новыя паводкі.

Сабор па тыпе «разумнага дома»

Вогненная стыхія бадай што застаецца адной з асноўных прычын знішчэння гістарычных рарытэтаў. Адзін з яскравых прыкладаў — «Залаты храм» у Кіёта. Гэта адзін з рэлігійных будынкаў комплексу Ракуон-дзі, ён быў пабудаваны ў 1397 годзе ў якасці рэзідэнцыі колішняга сёгуна Асікага Ёсіміцу. Пасля яго смерці ўвесь комплекс стаў будыйскім кляштарам, а ў Кінкаку-дзі, які вылучаўся аздабленнем залатымі лістамі, былі змешчаныя святыя рэліквіі. Храм згарэў дашчэнту ў 1950-м, адзін з манахаў спрабаваў скончыць жыццё самагубствам, але выжыў пры пажары. Сам храм пачалі рэканструяваць у 1950-я, работы занялі 32 гады. У сярэдзіне дзевяностых «Залаты храм» (золата ў аздабленні таксама аднавілі) быў уключаны ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, а гісторыя яго падпалу стала асновай для рамана культавага японскага пісьменніка Юкіа Місімы «Залаты храм», апублікаванага ў 1956 годзе.

У канцы мінулага стагоддзя ў графстве Беркшыр, наваколлі Лондана, гарэў Віндзорскі замак — рэзідэнцыя брытанскіх манархаў. Аднаўленчыя работы, што пачаліся адразу пасля пажару, скончыліся ў лістападзе 1997-га. Большай часткі памяшканняў вярнулі ранейшы выгляд, іншыя набылі новае аблічча ў адпаведнасці з агульным стылем. Дванаццаць гадоў таму, у маі 2007-га, загарэўся «Кат Сарк» — адзіны чайны кліпер XIX стагоддзя, які захаваўся. У 1954 годзе кліпер быў пастаўлены на вечную стаянку ў сухі док Грынвіча. Яго ўдалося аднавіць за пяць гадоў і 50 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў.

2 верасня 2018 года ў палацы Сан-Крыстава ў Рыа-дэ-Жанэйра, дзе размяшчаўся Нацыянальны музей Бразіліі, здарыўся вялізны пажар. Тут захоўвалася больш за 20 мільёнаў прадметаў. Музей валодаў адной з найбуйнейшых калекцый у Паўночнай і Паўднёвай Амерыцы, якая складалася з чучалаў жывёл, насякомых, мінералаў, індзейскага посуду, егіпецкіх і паўднёваамерыканскіх мумій і старажытнасцяў, археалагічных артэфактаў, метэарытаў, закамянеласцяў і многіх іншых экспанатаў. Людзі не пацярпелі, але агонь імкліва знішчыў практычна ўсю калекцыю.

Што датычыцца Нотр-Дама дэ Пары, то велічны будынак збіраюцца аднавіць за пяць гадоў. Мяркуецца, што на час рэканструкцыі сабор не зачыняць — туды змогуць патрапіць і турысты, і вернікі. Пасля пажару мноства архітэктараў прадаюць на разгляд свае планы аднаўлення Нотр-Дама. Паводле аднаго з такіх праектаў, прапануецца зрабіць з яго будынак па тыпе... «разумнага дома». Французскае архітэктурнае бюро Vincent Callebaut Architectures прадэманстравала адпаведны праект. Сонечныя панэлі будуць выпрацоўваць электрычнасць і цяпло. Шпіль упрыгожаць медным пеўнем, які вянчаў сабор раней і ацалеў пасля пажару. На даху прапануецца разбіць сад і агарод і збіраць да 21 тоны агародніны ды садавіны за сезон, пасля чаго раздаваць іх людзям, якія жывуць у нястачы.

Захар БУРАК.

Беларусь выступіць у фінале «Еўрабачання» пад нумарам 19

Фота Бел ТА.

Канчатковы парадак выступленняўсіх удзельнікаў у фінале міжнароднага песеннага шоу вызначылі прадзюсары і зацвердзіла кіраўніцтва Еўрапейскага вяшчальнага саюза. Так, адкрые канцэрт прадстаўніца Мальты Мікела, а завершыць яго прадстаўнік Іспаніі Мікі — вось такое забаўнае супадзенне. Беларуская артыстка ЗЕНА атрымала нумар 19, што з пункту гледжання запамінальнасці вельмі няблага. Усяго ж на конкурснай сцэне ў Тэль-Авіве прагучаць песні 26 краін — гэта так званая вялікая пяцёрка краін-заснавальніц (Вялікабрытанія, Германія, Іспанія, Італія, Францыя), Ізраіль як краіна-гаспадыня сёлетняга «Еўрабачання», і па 10 лідараў з кожнага паўфіналу.

Нацыянальныя журы ацанілі выступленні фіналістаў ужо ўчора падчас генеральнай рэпетыцыі, а сёння чарга за гледачамі, якія выявяць свае сімпатыі ў СМС, а тыя трансфармуюцца ў балы — ад 1 да 12. Тэлефонныя нумары для галасавання будуць абвешчаныя каментатарамі падчас прамога эфіру і абазначаны графікай на тэлеэкранах. Балы ад нашай краіны, дарэчы, абвесціць абаяльная Марыя Васілевіч — «Міс Беларусь — 2018» і «Міс свету Еўропа» (а ў хуткім часе і новая тэлевядучая — з 24 мая Марыя будзе весці папулярную праграму «Добрай раніцы, Беларусь!» у дуэце з каментатарам «Еўрабачання» Яўгенам Перліным).

Як зазначае дырэктар і тата беларускай канкурсанткі Аляксандр Купрыяновіч, настрой у ЗЕНЫ і ўсёй каманды «нармальны, баявы — мы нацэлены паказаць як мага лепшы вынік». І для такога настрою ёсць падставы: Беларусь выйшла ў фінал «Еўрабачання-2019», нягледзячы на тое, што букмекеры адводзілі нашай прадстаўніцы 33—34 выніковае месца. Магчыма, і ў прагнозах на перамогу яны памыліліся? Даведаемся ў ноч з 18 на 19 мая, а пакуль што — удачы канкурсантам і станоўчых эмоцый гледачам!

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Даты | Падзеі | Людзі

18 МАЯ

У краіне

1906 год — у Пецярбургу па ініцыятыве выкладчыка Пецярбургскага ўніверсітэта Б. І. Эпімах-Шыпілы заснавана першае легальнае беларускае выдавецкае таварыства «Загляне сонца і ў наша аконца». Існавала ў 1906—1914 гадах. Створана на кааператыўных пачатках групай перадавой беларускай інтэлігенцыі ў Пецярбургу. Таварыства ставіла перад сабой асветніцкія задачы. Нягледзячы на цяжкае фінансавае становішча, адсутнасць паліграфічнай базы, цэнзурныя рэпрэсіі, выдала лацінкай і кірыліцай 38 назваў кніг агульным тыражом больш за 100 тысяч паасобнікаў. Сярод іх першыя падручнікі на сучаснай беларускай мове: «Беларускі лемантар, або Першая навука чытання» К. Каганца, «Першае чытанне для дзетак беларусаў» Цёткі, творы Я. Купалы і Я. Коласа, мастацкую літаратуру, паштоўкі з краявідамі Беларусі і партрэтамі беларускіх пісьменнікаў.

1929 год — нарадзіўся Анатоль Уладзіміравіч Жалдакоў, заслужаны архітэктар Беларусі. У 1954 годзе скончыў Маскоўскі архітэктурны інстытут. З 1970 года працаваў у інстытуце «Белдзіпрапрыбор». Асноўныя работы ў Беларусі: мінскі крыты рынак «Камароўскі», універсамы «Рыга», «Талін», службова-гаспадарчы корпус Савета Міністраў Беларусі, будынкі Міністэрства гандлю і Міністэрства спорту і турызму ды іншыя.

1938 год — нарадзіўся (вёска Цынцавічы Вілейскага раёна) Міхаіл Антонавіч Казінец, дырыжор, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, народны артыст Беларусі. З 1972 года — дырыжор, з 1975-га — мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча. У 1985—2005 гадах быў рэктарам Беларускай акадэміі музыкі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі «За духоўнае адраджэнне».

1942 год — у акупаваным Мінску патрыёты-падпольшчыкі выпусцілі першы нумар газеты «Звязда».

1954 год — нарадзіўся (г. Мінск) Ігар Вячаслававіч Марозаў, беларускі архітэктар, педагог, доктар культуралогіі, кандыдат архітэктуры, прафесар. Працуе ў галіне манументальнага мастацтва: помнікі Рагнедзе і Ізяславу ў Заслаўі, Максіму Танку ў вёсцы Пількаўшчына Мядзельскага раёна, князю Барысу ў г. Барысаў. Аўтар навуковых прац па праблемах тэорыі і філасофіі дойлідства, герменеўтыцы культуры. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

1994 год — Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь прыняў пастанову «Аб увекавечанні памяці ахвяр лагера смерці Трасцянец» (1942—1944 гг.).

1998 год — у Мінску адкрыты Музей сучаснага выяўленчага мастацтва. У калекцыі каля 2,5 тысячы экспанатаў — твораў сучасных беларускіх аўтараў. Прадстаўлены класічны жывапіс, графіка, скульптура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, фота і плакаты.

У свеце

1048 год — нарадзіўся Амар Хаям, персідскі і таджыкскі паэт, матэматык, філосаф. Яго рубаі (чатырохрадкоўі) карыстаюцца сусветнай папулярнасцю. Памёр у 1131 годзе.

1899 год — у Гаазе распачала работу першая мірная канферэнцыя, скліканая па ініцыятыве Расіі, з мэтай распрацоўкі шматбаковых пагадненняў у галіне законаў і звычаяў вайны (Гаагская канферэнцыя міру). Паклала гістарычны пачатак працэсу раззбраення, усталяванню правілаў вядзення вайны і мірнага вырашэння міждзяржаўных спрэчак.

1914 год — нарадзілася Ала Баянава — руская эстрадная спявачка, выканаўца рускіх песень і рамансаў, народная артыстка Расіі. Памерла ў 2011 годзе.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	5.03	21.10	16.07
Віцебск	4.46	21.06	16.20
Магілёў	4.53	21.00	16.07
Гомель	4.57	20.49	15.52
Гродна	5.19	21.24	16.05
Брэст	5.27	21.17	15.50

Месяц

Першая квадра 12 мая.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Ірыны, Абрама, Якава.*
К. *Аляксандры, Наталлі, Эрыка, Яна.*

Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Сіла волі ў жанчын вымяраецца ў кілаграмах, а ў мужчын — у літрах.

— Вы шарлатанка, а не прадракальніца!

— Я ведала, што вы так скажаце.

Толькі калі народзіш, ты зразумееш, што такое шчасце. Але будзе ўжо позна.

— Заўтра ў мяне выпіваем. З мяне стол, з вас выпіўка.

— А можна я таксама лепш стол прынясу?

— Ты можаш больш сціпла апрануцца? Усё ж у падатковую едзем, а не ў рэстаран…

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1602.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 17 мая 2019 года.